Bielarus561C.qxd 10/8/2009 10:45 PM Page 3

Жыве Беларусь!

# БЕЛАРУС

Address: P. O. Box 3225
Farmingdale, NY 11735

BIELARUS/Belarusan newspaper in Free World ISSN 1054-9455
Published by the Belarusan American Association, Inc.

№ 561 Кастрычнік 2009 г.
Год выданьня 60



## Фронт, апазыцыя, калябарацыя

**Зянон ПАЗЬНЯК**

У 90-х гадох Беларускі Народны Фронт пасьпяхова супрацьстаяў “аб’яднаўчым” тэхналёгіям зьнішчэньня беларускага руху. КГБ звычайна рабіў стаўку на агентуру і прапаганду. (У адрозьненьне ад Эўропы, якая спадзяецца на грошы). Дзеяньні канторы тады былі такія-ж прасталінейныя і прымітыўныя, як і цяпер. Яна наствара́ла карлікавых арганізацыяў, узяла пад кантроль малыя партыі і выпусьціла лёзунг, што трэба “аб’яднаць” дэмакратычны рух. Дзеячы партыяў пачалі прапаноўваць БНФ усіх аб’яднаць, бо разам, маўляў, мы сіла. Аднак гэтыя канторскія казкі са спасылкамі на ўсходнія мудрасьці пра галінкі ды венік ня мелі ніякага эфэкту. Кожны фронтавец бачыў і разумеў няхітрую задумку “пакіраваць Фронтам” (а потым яго разваліць). Праўда, адразу выявіліся ў Фронце людзі (прытым адукаваныя), якія чамусьці ўпарта ўвесь час нічога не разумелі і клікалі аб’ядначацца з маргіналамі (аж цікава было назіраць). Потым сымптомы сьцішыліся. Але толькі да таго часу пакуль у беларускую палітыку не ўмяшалася эўрабюракратыя (у супрацоўніцтве з КГБ – Ганс Вік) і не прапанавала пад узгодненыя праекты дармовыя грошы. Вось тут і пачаліся пераменны, якія збочылі сьведамасьць, перакруцілі аргумэнтацыю, перамянілі саму істоту некаторых людзей.

Усё пачалося за часы маёй адсутнасьці на Радзіме. Утварылася група дзеячоў у верхавіне БНФ, якія сталі спадзявацца на заходнія рэсурсы (дзеля Фронту, вядома-ж). Яны назваліся “новай хваляй”. Ім адразу захацелася аб’ядноўвацца з усімі і з кім скажуць грошадаўцы. Тут яны былі сьмелымі і не баяліся страціць сябе.

Аднак першае патрабаваньне “спонсараў” было не “аб’ядноўвацца”, а пазбавіцца ад старшыні БНФ (які апынуўся ў эміграцыі), інакш, паведамілі ім: “форсы” ня будзе. Перамагла “форса” (бо ня пахне). Адзін блытанік з кіраўніцтва БНФ (мой намесьнік па Фронту) у парыве шчырасьці нават напісаў тады, што нацыянальная ідэя сябе ўжо вычарпала, Фронт выканаў сваю місію і таму трэба яго аб’яднаць з прамаскоўскай партыяй АГП.

У 1999 годзе паплечнікі пайшлі напралом. Не падпарадкаваліся вынікам галасаваньня зьезду, выкарысталі моладзь і, цярпячы паразу, рашыліся на раскол, развалілі Народны Фронт.

Потым былі выбары прэзыдэнта ў 2001 годзе. “Новая хваля” зьбірала подпісы, падтрымлівала і агітавала за закаранелага ворага БНФ, члена бюро ЦК КПБ (КПСС), мацёрага намэнклятуршчыка Ўладзімера Ганчарыка, зь якім Фронт змагаўся яшчэ на выбарах 1990 году (і, дарэчы, перамог). Так ім сказалі рабіць спадары з заходніх амбасадаў, і так яны зрабілі. Гэтым самым “новая хваля” засьведчыла, што яна выпала зь беларускай нацыянальнай палітыкі.

Потым усё пайшло па нахіленай плоскасьці: кааліцыі з камуністамі, з прамаскоўскімі арганізацыямі, паездкі ў Маскву да Караганава (цэнтар гэбоўскай аналітыкі і прапаганды) і г. д.

Вяршыняй усяго гэтага апартунізму стаў 2004 год – агітацыя і ўдзел у незаконным рэфэрэндуме аб прадаўжэньні прэзыдэнцкіх тэрмінаў для Лукашэнкі. Такое дзеяньне груба не адпавядае Канстытуцыі, зьяўляецца злачынным актам і можа кваліфікавацца як садзеяньне ў антыканстытуцыйным захопе ўлады шляхам правядзеньня незаконнага рэфэрэндуму і імітацыі дэмакратычнага галасаваньня.

У вольнай Беларусі партыі, якія ўдзельнічалі ў гэтай кампаніі (прытым за замежныя сродкі) павінны будуць стаць перад беларускім судом.

Палітычны фініш “новай хвалі” адбыўся ў 2004 годзе. Далейшы ход падзеяў гэта быў працэс маразму і палітычнай дэградацыі прагматыкаў, што замянілі ідэю на грошы.

У 1999 годзе, калі раскалолі Фронт, я казаў, што адыход “новай хвалі” ад ідэі, спакушэньне чужымі грашыма прывядзе да калябарацыі і апартунізму, што працэс палітычнай энтрапіі паўторыцца. Так яно і адбываецца. Але ўсё яно пасьля 2004 году ўжо ня мае ніякага значэньня. Паўтаруся, гэтая частка Фронту даўно выпала зь беларускай нацыянальнай палітыкі. Нават шкода часу і паперы пра гэтую сумную зьяву пісаць.

Людзі, якія прыплылі потым да “новай хвалі”, не маглі быць людзьмі вялікіх і сьветлых ідэалаў, бо ў рэальнасьці іх ужо там не было. Вычысьцілі нават фронтаўскую гісторыю. Цяпер прагматыкі былой “новай хвалі” пажынаюць плады свайго прагматызму. Яны так зьдзіўленыя, так абураныя прагматызмам новай генэрацыі, гавораць пра “рэйдэрскі захоп” іхняй арганізацыі. І трэба-ж так... Некалі я напісаў сабе трациіну пра прагматызм. Цяпер прыпомнілася:

Яны сталі поўзаць,
Думаючы, што потым
Будуць лятаць.

**Заканчэньне на бачыне 4**

## Пікет пратэсту ў Нью-Ёрку

12 верасьня каля будынку ААН у Нью-Ёрку Беларускі Моладзёвы Рух Амэрыкі зладзіў акцыю пратэсту супраць уводу расейскіх войскаў на тэрыторыю Беларусі для вучэньняў.

8 верасьня адзначалася гадавіна Аршанскай бітвы, у якой нашыя гераічныя продкі ў 1514-м годзе атрымалі перамогу над маскоўскім войскам. Гэтая перамога дазволіла тады спыніць напады расейцаў на нашыя землі на доўгі час. І вось праз 495 гадоў пасьля Аршанскай бітвы эшалёны расейскіх войскаў ізноў увайшлі ў Беларусь. Зроблена гэта было з дазволу ўзурпаваўшага ўладу гэтак званага прэзыдэнта Беларусі Лукашэнкі: салдаты расейскай арміі ў колькасьці 6 тысяч прымуць удзел у вайсковых вучэньнях “Захад-2009”.

Увод замежных войскаў у краіну – парушэньне Канстытуцыі, бо яна абавязвае захоўваць нэйтралітэт. Дазвол-жа на ўвод чужых войскаў – чарговая зьнявага беларускага народу апошнім эўрапейскім дыктатарам.

Брутальна разагнаная ў цэнтры Менску мірная акцыя пратэсту супраць уводу расейскіх войскаў – факт, які ярка сьведчыць пра амаральнасьць цяперашніх вышэйшых афіцыйных уладаў Беларусі і дэманструе жахлівасьць кіруючага рэжыму краіны – па сваёй сутнасьці антыбеларускага. А халуйскае падпарадкаваньне антыканстытуцыйным загадам – гэта ганьба для беларускіх афіцэраў.

Моладзь, якая сабралася на акцыі каля будынку ААН, асудзіла рашэньне ўладаў краіны дазволіць войску іншай краіны ўсупіць на тэрыторыю Беларусі.

16 верасьня спаўнілася дзесяць гадоў ад часу зьнікненьня Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага. Беларуская моладзь Амэрыкі напрыканцы акцыі ўшанавала памяць забітых беларусаў і выказала падтрымку сваім сябрам на Бацькаўшчыне, якія змагаюцца за дэмакратызацыю краіны.

**Паводле www.belmov.org**



## Імпрэза, прысьвечаная Натальлі Арсеньневай

У грамадзкай залі сабору сьв. Кірылы Тураўскага у Брукліне 20 верасьня адбылася ўрачыстая імпрэза, прысьвечаная 106-м угодкам з дня нараджэньня выдатнай паэткі беларускай эміграцыі Натальлі Арсеньневай.

Прысутныя пазнаёміліся зь нялёгкім жыцьцёвым шляхам аўтаркі словаў беларускага рэлігійнага гімну “Магутны Божа”, паслухалі дэклямацыю яе лепшых паэтычных твораў.

Удзельнікам імпрэзы былі прапанаваныя для прагляду два дакумэнтальныя фільмы “Далёка нам яшчэ да БНР” і “Дзень Волі”.

Імпрэза была падрыхтаваная і праведзеная сябрамі Беларускага Маладзёвага Руху Амэрыкі.

**Паводле belmov.org**

# Канфэрэнцыя краінаў Балтыі і Беларусі

У Вільні 5-6 верасьня 2009 г. адбылася IV канфэрэнцыя беларусаў краінаў Балтыі і Беларусі, арганізаваная Таварыствам беларускай культуры ў Літве. На ёй прысутнічалі госьці зь Беларусі, Латвіі, Эстоніі, Польшчы, Расеі. Не абмінулі ўвагай і летувіскія ўлады (прысутнічаў прэм'ер-міністар Андрус Кубілюс, генэральнаы дырэктар дэпартамэнту нацменшыняў Арвідас Даўнаравічус ды інш..), а таксама старшыні летувіскіх грамадзкіх арганізацыяў (Альфонсас Аўгуліс, Казімерас Гаршва і др.).

Працу кафэрэнцыі пачалі з прывітальнага слова старшыні ТБК Хведара Нюнькі, які ўсім пажадаў плённа правесьці гэтыя два дні.

Затым удзельнікаў віталі прадстаўнікі летувіскай улады. Прыемным было пачуць ад прэм'ер-міністра Летувіскай Рэспублікі Андруса Кубілюса, што беларусы зьяўляюцца неад'емнай часткай Вільні і гісторыі ВКЛ, што і беларусы маюць сваё месца ў гісторыі Вільні, які ёсьць ня толькі горадам летувіскай культуры, але і жыдоўскай, польскай, расейскай, украінскай.

І іншыя прадстаўнікі летувіскіх уладаў гаварылі аб значным укладзе беларусаў у гісторыю Вільні і аб іх глыбокіх каранях у ёй. Ня раз падкрэсьлівалася мірнае суіснаваньне нашых народаў і тое, што яны ўзбагачалі адзін другога на ўсёй тысячагадовай гісторыі.

Фармат канфэрэнцыі розьніўся ад папярэдніх. Гэтым разам удзельнікам зь іншых краінаў давалася заданьне прадставіць сябе на гэтай канфэрэнцыі.

З Калінінграду суполка ўжо ня першы раз рэпрэзэнтавала сябе граньнем на цымбалах. Іх прыгожае мілагучнае гучаньне нясьля гукі далёкае і незабыўнае Бацькаўшчыны з надзеяй у яе адраджэньне.

Прыемна зьдзівілі беларусы Латвіі сваёй праграмай. У прыгожых і дзіўных галасах беларусаў з Рыгі чуліся сьпевы зямлі продкаў, якія заклікалі да вяртаньні да каранёў, да вытокаў.

Польскія беларусы, дарэчы як і эстонскія, распавялі ў асноўным аб сваіх уласных праблемах, аб сытуацыі беларускай меншасьці ў сваіх краінах і аб беларускіх СМІ ў іх. Варта адзначыць, што ў Польшчы яны пастаўленыя на высокі ўзровень, выдаецца штотыднёвая газэта „Ніва", працуе беларускае радыё „Рацыя", выходзяць беларускія перадачы на польскім радыё.

Сп. Алег Трусаў у сваім выступе адзначыў шмат станоўчых вынікаў, зробленых па вяртаньні беларускай мовы ў грамадзтва. Ён перакананы, як і 10 год назад, што ўлада, перадусім чынавенства, беларускую мову не пакіне. Праблема ў гэтым пакаленьні чыноўнікаў, якое было выхавана ў савецкай сыстэме і па-іншаму не разумела Беларусь, як частку той эпохі і расейскамоўную, без гісторыі і герояў. А вось гэтае пакаленьне, якое ўзгадавалася ў гады незалежнасьці, пачынае разумець Беларусь і спрычыняецца да яе адраджэньня.




Сп. Зянон Пазьняк у каторы раз падкрэсьліў неабходнасьць кансалідацыі і супольных дзеяньняў па выратаваньні Беларусі. Эўразьвязу далёка да праблемаў нашае Бацькаўшчыны і там іх нават і не разумеюць. Да прыкладу, звычайныя выбары прэзыдэнта. Шаноўны прамоўца лічыць злачынствам увогуле ўдзел у іх, бо гэта легалізуе рэжым Лукашэнкі. І таму байкот і толькі байкот зможа стаць тым чыньнікам, з дапамогай якога можна перамагчы гэтую антыбеларускую акупацыйную уладу. У Беларусі, па словах спадара Пазьняка, склалася яшчэ адна небясьпека, калі ўлада ў краіне апынулася ў руках намэнклятуры. Менавіта чыноўнік вырашае ўсё ў краіне. Чынавенства стала своеасаблівай бізнеспраслойкай у краіне, калі самыя багатыя людзі – не бізнесоўцы, а прыслужнікі рэжыму. Чые дзеці ў асноўным навучаюцца ў прыстыжных эўрапейскіх навучальных установах? Дзеці чыноўнікаў. Хто раскрадае краіну? Бюракраты.

Мікола Статкевіч адзначыў слабасьць, раз'яднанасьць беларускай апазыцыі і яе асноўную праблему – адсутнасьць лідэра. Калі ў часе апошніх прэзыдэнцкіх выбараў народ выйшаў на плошчу бараніць свой выбар, то нават апазыцыйныя кандыдаты ў прэзыдэнты не змаглі іх ні падтрымаць, ні выказаць удзячнасьць.

Павал Севярынец адзначыў вялікі духовы патэнцыял нацыі і хрысьціянскіх каштоўнасьцях беларусаў, на якіх павінна будавацца незалежная Беларусь. Ён гаварыў і аб праблемах сваёй партыі Беларускай Хрысьціянскай Дэмакратыі. Улады яе ня хочуць рэгістраваць, хоць колькасьць яе сяброў імкліва павялічваецца.

Прадстаўнікі грамадзкіх арганізацый, дзеячы культуры і навукі ў асноўным спыняліся на ўласных праблемах, зь якімі сутыкаюцца, працуючы на ніве беларускасьці, а таксама дзяліліся і посьпехамі, якіх змаглі дасягнуць у гэтых цяжкіх умовах.

Спадар Вячка Целеш (Рыга) адзначыў, што ў Вільні, у адрозненьні ад Рыгі, ёсьць ня толькі месцы, дзе некалі віравала беларускасьць, але і помнікі беларускасьці, гэта мэмарыяльныя шыльды, магілы беларускіх дзеячоў, да якіх можна прыйсьці пакланіцца і ўскласьці кветкі. Але і ў самой Рызе ня ўсё так трагічна. Дзейнічае грамадзкая арганізацыя беларусаў „Сьвітанак", ёсьць беларуская школка. Хоць у даваенны Латвіі было 4 беларускія дзяржаўныя гімназіі, вялікая колькасьць школаў. Дзе яны сёньня?

Спадарыня Маргарыта Пярова з Санкт-Пецярбургу распавяла аб беларушчыне ў гэтай, як яна зазначыла, беларускай сталіцы. Сапраўды, на пачатку XX стагодзьдзя, было два цэнтры, дзе пачыналася беларускае адраджэньне: Вільня і Пецярбург. Пецярбург зьвязаны з імем Браніслава Эпімах-Шыпілы. Спн. Пярова займаецца пытаньнямі папаўненьня фондаў беларускіх кніг у бібліятэцы Санкт-Пецярбургу і прасіла, па-магчымасьці, дапамагаць ёй у гэтай справе і ахвяроўваць кнігі, матэрыялы, фільмы, зьвязаныя зь Беларусьсю. Лістуючыся з архівамі сп. Пяровай ўдалося ўстанавіць і дакладнейшую дату сьмерці Антона Луцкевіча, які адыйшоў у вечнасьць не ў 1946 г., а 23 сакавіка 1942 г.

Шмат сумнага гучала ў выступе Ганны Кандрацюк зь Белавежы. Беларусы ў Польшчы, па яе словах, ня маюць будучыні, яны ўсё часьцей называюць сябе палякамі. Яна адзначыла вялікую працу па захаваньні беларускай спадчыны рэгіёну, якая праводзіцца ў Беластоку.

Доктар Лілія Плыгаўка зь Віленскага пэдагагічнага ўнівэрсытэту распавяла аб стварэньні беларускай катэдры ва ўнівэрсытэце і стварэньні Віленскай беларускай школы імя Ф. Скарыны. Яна зазначыла, што выпускнікі ўнівэрсытэту несуць беларускасьць у масы, бо навучаньне так ці інакш фармуе ў іх беларускасьць.

На канфэрэнцыі адбылася прэзэнтацыя новага двухсэрыйнага дакумэнтальнага фільму ТБК рэжысэркі Вольгі Мікалайчык "Беларускія справы".

З прыгожым канцэртам выступіла Віленская беларуская школа імя Францішка Скарыны.

Была абраная рэдакцыйная камісія у складзе: Алега Трусава, Уладзімера Хільмановіча, Вячкі Целеша і Алеся Адамковіча. Яе абавязкам стала выпрацоўка зваротаў да дзяржаўных ворганаў Летувы, Беларусі, Эўразьвязу. Падрабязней з прынятымі зваротамі можна пазнаёміцца на сайце www.westki.info/tbk .

Вялікую падзяку хочацца выказаць ЗБС "Бацькаўшчына" за дапамогу ў правядзеньні канфэрэнцыі. На ёй прысутнічалі старшыня Згуртаваньня Алена Макоўская і яе намесьніца Ніна Шыдлоўская.

У канцы канфэрэнцыі ўсіх парадавалі арганізаваным канцэртам у ратушы. Зь Менску прыехалі два беларускія гурты, якія пазнаёмілі зь беларускай музыкай XIX ст. і музыкай беларускага сярэднявечча.

Вядучымі на канфэрэнцыі былі Крысьціна Балаховіч і Андрусь Старавойтаў.

***Алесь АДАМКОВІЧ, Вільня***

## Шахматы для ўсіх

Паважаныя чытачы, я працягваю свой аповед пра гісторыю шахмат. У мінулым нумары я распавяла пра паходжаньне шахмат. Нагадаю, што першыя шахматы – чатуранга – нарадзіліся ў Індыі за 1000 гадоў да нараджэньня Хрыста.

З Індыі, прыкладна ў VI-м стагодзьдзі пасьля нараджэньня Хрыста, чатуранга трапіла на Блізкі Ўсход. Назва зьмянілася на **шатранг** у пэрсаў, **шатрандж** – у арабаў. Менавіта арабы моцна паспрыялі развіцьцю шахмат і іх распаўсюджаньню ў сьвеце.

Найбольшага пашырэньня шатрандж дасягнуў у VIII-IX-х стагодзьдзях. Арабы пачалі ляпіць шахматныя фігуры з гліны (замест слановай косьці), што зрабіла іх дасягальнымі для простага люду. У правілы гульні былі унесеныя значныя зьмены. Так, замест чатырох чалавек у шатрандж сталі гуляць двое. Хадзіць пачалі па чарзе замест касьцей, якія кідаліся ў чатуранзе. Упершыню на шахматнай дошцы зьявілася каралева, але яна тады была найслабейшай фігурай, хадзіла толькі на адну клетку па дыяганалі і лічылася "дарадчыкам" караля. Шатрандж усе болей і болей паходзіў на сучасныя шахматы, але фігуры ня мелі сучаснай дальнабойнасьці, таму гульня цягнулася вельмі павольна. Мат у шатранджы здараўся вельмі рэдка. Звычайным было гуляць на "зьнішчэньне". Гулец, які першы зьнішчыць усе фігуры суперніка, акрамя караля, аб'яўляўся пераможцам. Цікава, што пат, як і мат, лічыўся перамогай, але і пат, і мат былі надзвычайна рэдкімі, настолькі рэдкімі, што людзі пачалі запісваць тыя сытуацыі. Так зьявілася першая апісальная шахматная натацыя, шахматныя задачкі і эцюды.

Прыкладна ў X-XI стагодзьдзях шахматы, у выглядзе шатранджу, трапілі ў Гішпанію, якая лічыцца радзімай сучасных шахмат. У правілы шахмат былі ўнесеныя істотныя зьмены, якія захаваліся да сёньняшніх дзён. Дошка стала двухкаляровай, каралеве і іншым фігурам была дададзеная моц, пешкам стала дазволена скакаць на дзьве клеткі на першым ходзе, была ўведзеная сучасная ракіроўка. З Гішпаніі шахматы распаўсюдзіліся па ўсёй Эўропе. Найбольшую папулярнасьць гульня набыла ў Італіі й Францыі, але адрозьненьні ў правілах паміж рознымі краінамі захоўваліся аж да канца XVIII-га стагодзьдзя. Толькі ў пачатку XIX-га стагодзьдзя былі ўведзеныя адзіныя міжнародныя правілы і праведзеныя першыя міжнародныя турніры.

Ну а зараз да нашага конкурсу. Нажаль, правільных адказаў на задачку, пададзеную ў мінулым нумары, ня было. Дзякуй вялікі ўсім, хто спрабаваў яе адгадаць. Вось правільны адказ:

1. Фе4 Схе4
2. Лg8 мат

альбо

1. Фе4 Крb8
2. Фе8 мат

Чакаю ад вас адказаў на наступную задачку. Ход белых, мат у два хады. Лісты дасылайце на мой адрас у інтэрнэце: *palina_churun@yahoo.com*. Жадаю посьпехаў!

***Паліна ЧУРУН***



Bielarus561C.qxd 10/8/2009 10:45 PM Page 5



# Беларусь за месяц

## Мова ў грамадзтве

Інфармацыйна-аналітычны цэнтар пры Адміністрацыі прэзыдэнта правёў дасьледаваньне наконт ужываньня беларускай мовы ў грамадзтве. Так, паводле яго 29,4% вольна размаўляюць, чытаюць і пішуць па-беларуску; 52,5% – могуць размаўляць і чытаць; 8,3% – разумеюць, але размаўляць і чытаць ня могуць; 7% – разумеюць толькі словы, падобныя на расейскія; 10% – зусім ня ведаюць беларускай мовы; 1,7% – не ўсьпрымаюць.

Мова штодзённага ўжытку: 72% – расейская; 11,9% – беларуская. Па-расейску ў гарадах гавораць 78,7%, у Менску – 83,2% жыхароў. У вёсцы ў штодзённым ужытку карыстаюцца беларускай мовай 18,8%. Па-беларуску стала размаўляюць толькі 19,9% пэнсіянэраў і 6% людзей, малодшых за 30 гадоў.

Беларуская мова родная для 45,6% вяскоўцаў і 33,1% гараджан. Сярод апытанай моладзі 33,1% рэспандэнтаў лічаць беларускую мову роднай. Прыкладна такія-ж пытаньні будуць зададзеныя падчас перапісу насельніцтва, што пройдзе ў Беларусі з 14 па 21 кастрычніка.

## Адказ "беларуская"

З нагоды перапісу насельніцтва кіраўнікі 27 арганізацый ды лідэры беларускай інтэлігенцыі зьвярнуліся да грамадзкасьці. У звароце ўвага зьвяртаецца на тое, адным з пытаньняў перапісу будзе пытаньне пра родную мову (засвоеную зь дзяцінства), а таму вынікі перапісу маюць вялікае значэньне. У 1999 г., выступаючы супраць русіфікацыі, беларускую мову назвалі роднай 35% рэспандэнтаў.

"Адказ "беларуская" на пытаньні перапісчыкаў аб роднай мове і штодзённага ўжытку мае практычнае значэньне. Ад колькасьці людзей, якія ў адказах назавуць беларускую мову, будзе залежаць далейшая палітыка дзяржавы", – гаворыцца ў звароце.

Зварот падпісалі старшыня ЗБС "Бацькаўшчына" Алена Макоўская, пісьменьнікі Генадзь Бураўкін, Ніл Гілевіч, Уладзімер Арлоў, акадэмік Радзім Гарэцкі, прафэсар Анатоль Грыцкевіч, актрыса Сьвятлана Зелянкоўская, сьпевакі Лявон Вольскі, Зьміцер Вайцюшкевіч, Віктар Шалкевіч, старшыня ТБМ Алег Трусаў, галоўны рэдактар газэты "Наша Ніва" Андрэй Скурко, мастакі Аляксей Марачкін і Артур Клінаў ды яшчэ больш за дзясятак дзеячаў.

## Візыт патрыярха

З 25 па 28 верасьня ў Беларусі з афіцыйным візытам знаходзіўся патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл. Гэта быў першы яго візыт у ранзе кіраўніка Рускай Праваслаўнай Царквы.



Прылёт патрыярха пакінуў дваістае ўражаньне. З аднаго боку кіраўнік РПЦ трымаўся панад людзьмі, не было праведзена ніводнага багаслужэньня пад яго кіраўніцтвам. З іншага боку зрабіў некалькі цікавых заяваў.

Так, ён заявіў, што Беларусь ніякі ня мост і ня шлюз паміж Усходам і Захадам, а тэрыторыя, якая разьмешчана паміж Расеяй і заходнім сьветам ды зьяўляецца часткай праваслаўнай цывілізацыі. На сустрэчы з Лукашэнкам Кірыл сказаў, што нічога ня ведае пра высілкі кіраўніка беларускай дзяржавы па арганізацыі яго сустрэчы з Папам Рымскім.

Сэнсацыйным выглядаў выступ патрыярха ў Палацы Рэспублікі, дзе ён заявіў, што сымбалемі пакутаў Беларусі зьяўляюцца Курапаты, дзе сталіністамі былі расстраляныя дзясяткі тысяч людзей, і Хатынь, якая сымбалізуе спаленыя нацыстамі вёскі.

Слова "Курапаты" ўпершыню прагучала за часамі Лукашэнкі з высокай трыбуны. Падчас сустрэчы з моладзьдзю ў Віцебску патрыярх заявіў, што сапраўдным "Імем Беларусі" (сымбалем) павінна стаць Еўфрасіньня Полацкая, а не розныя дыктатары ці тыраны.

## Візыт Папы Рымскага

Інфармацыя пра тое, што Бэнэдыкт XVI наведае зь візытам Беларусь, зьявілася ў беларускіх мэдыях у сярэдзіне верасьня. Казалася, што складзены сьпіс краінаў, якія плянуе наведаць Папа, і цяпер ідзе выбар паміж прыездам у траўні 2010 г. у Беларусь ці Партугалію.

Цяпер вядома, што Бэнэдыкт XVI накіруецца ў Партугалію на чарговую гадавіну зьяўленьня Багародзіцы ў Фаціме. Праўда, ня выключана, што ўсё яшчэ зьменіцца.

## Эўразьвяз лепшы

Сэнсацыйныя вынікі сацыялягічнага апытаньня атрымаў у верасьні Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў (НІСЭПД). Апытаным задалі пытаньне: "Каб давялося выбіраць паміж аб'яднаньнем з Расеяй і ўступленьнем ў Эўрапейскі Зьвяз, што-б вы выбралі?". 42,7% выбралі Эўразьвяз, Расею – 38,3%.

На пытаньне "Каб зараз у Беларусі ладзіўся рэфэрэндум з пытаньнем, ці ўступаць Беларусі ў Эўрапейскі Зьвяз, які быў-бы ваш выбар?" "За" выказаліся 44,1%, "супраць" – 32,8%. Год таму за ўступленьне ў Эўразвяз выказваліся 26,7% апытаных.

Такі рост эўрапрыхільнікаў можна патлумачыць і рэзкім зьніжэньнем антызаходняй прапаганды ў СМІ і на тэлеканалах з аднаго боку і з другога антырасейскай рыторыкай СМІ (малочная вайна і г. д.) і кіраўніка беларускай дзяржавы.

## Штрафы за крыжы

Вялейскі суд пакараў 2 кастрычніка штрафамі мясцовых грамадзкіх актывістаў Аляксея Сюдака, Уладзімера Малярчука і Алеся Наркевіча за ўсталяваньне крыжоў ва ўрочышчы Красны Беражок. Іх абвінавацілі ў правядзеньні несанкцыянаванага мітынгу падчас усталяваньня крыжоў у памяць расстралянага саветамі ў 1950 годзе лідэра няўзбройнага моладзевага руху Расьціслава Лапіцкага ды наогул усіх ахвяр савецкіх рэпрэсій.

Крыжы былі ўсталяваныя 1 верасьня, але празь некалькі дзён былі зьнесеныя мясцовымі ўладамі. Грамадзкія актывісты зьвярнуліся ў міліцыю з просьбай пакараць вандалаў. Выйшла наадварот. У дачыненьні да самых удзельнікаў жалобнай акцыі была распачата адміністрацыйная справа за правядзеньне несанкцыянаванага мітынгу.

Судзьдзя Юры Абрамчык аштрафаваў А. Сюдака і Ў. Малярчука на 1 млн 50 тысяч рублёў (гэта 380 даляраў ЗША), А. Наркевіча – на 700 тыс. руб. (255 даляраў). Як для Вялейкі, гэта вельмі вялікія сумы.

Ні адзін з актывістаў і ня думае здавацца, яны будуць працягваць сваю дзейнасьць і зьбіраюцца абскардзіць прысуд.

## БНФ далучаецца да блёку

26 верасьня прайшоў першы пасьля зьезду Партыі БНФ (5 верасьня) Сойм, які падтрымаў ідэю стварэньня ў Беларусі нацыянальна-дэмакратычнага блёку. Ідэю стварэньня такога блёку ў свой час агучыў лідэр руху "За Свабоду" Аляксандар Мілінкевіч. Заявілі намер далучыцца да блёку аргкамітэт па стварэньні партыі "Беларуская хрысьціянская дэмакратыя" на чале з Паўлам Севярынцам, а таксама "Малады фронт". Партыя БНФ таксама адмовілася ад састаршынства ў Аб'яднаных дэмакратычных сілах.

## "Захад-2009"

18–29 верасьня ў Беларусі прайшлі сумесныя беларуска-расейскія апэратыўна-стратэгічныя вучэньні "Захад-2009". Колькасьць войскаў, якія ўдзельнічалі ў іх, склала 12,5 тыс. чалавек. У тым ліку зь беларускага боку – каля 6,5 тыс. чалавек, ад Расеі – 6 тыс., ад узброеных сіл Казахстану – каля 30 чалавек. Для ўдзелу ў вучэньнях з запасу было прызвана 1,8 тыс. ваеннаабавязаных. Галоўным месца вучэньняў стаў Абуз-Лясноўскі палігон у Баранавіцкім раёне.

29 верасьня вучэньні наведаў прэзыдэнт Расеі Дзьмітры Мядзьведзеў, які заявіў, што цяпер вучэньні будуць праводзіцца раз у два гады. Прыехаў на вучэньні і Аляксандар Лукашэнка з малодшым сынам.

## П'еса пра "Курск"

У найкрайсьветнай Аўстраліі ў верасьні была пастаўленая п'еса пра трагедыю на расейскай падводнай лодцы "Курск", якая затанула падчас вучэньняў у жніўні 2000 г. у Баранцавым моры.

Аўтар п'есы – аўстралійскі рэжысэр беларускага паходжаньня Саша (Станіслаў) Яновіч – зьбіраў матэрыялы сем гадоў. За гэты час ён двойчы наведваў Расею, прывёз мноства кніг, сустракаўся зь сем'ямі падводнікаў.

У верасьні п'еса ішла ў Сіднэі. Крытыкі ўжо назвалі спэктакаль адной з найлепшых тэатральных пастановак году ў Аўстраліі.

Саша Яновіч нарадзіўся ў Менску, вышэйшую адукацыю атрымаў у Польшчы, ад 2000 г. жыве ў Аўстраліі. Ён вядомы ня толькі як рэжысэр, але і як пісьменьнік, актор, журналіст.

## Паразы БАТЭ

Зь дзьвюх паразаў стартаваў барысаўскі БАТЭ у групавым турніры футбольнай Лігі Эўропы. 17 верасьня клюб прайграў у Лісабоне "Бэнфіцы" – 0:2, а 1 кастрычніка ў Менску прайграў ангельскаму "Эвэртану" – 1:2. Адзіны гол у беларусаў на рахунку Дзьмітрыя Ліхтаровіча. Наступны матч БАТЭ правядзе 22 кастрычніка ў Менску супраць грэцкага АЕКа, 5 лістапада – выезд у Афіны. 2 сьнежня матч з "Бэнфікай" у Менску, 17 сьнежня з "Эвэртанам" – у Ліверпулі.

*Уласны карэспандэнт*

# "Беларускаму трыялёгу" 10 гадоў



Упачатку жніўня ў Крынках і Лапічах на Беласточчыне (сёньня польская, а калісьці беларуская тэрыторыя, якую Сталін разам з 500 тыс. беларусаў падараваў Польшчы) адбыўся юбілейны дзясяты "Беларускі трыялёг". Таксама споўнілася 10 гадоў таварыству "Віла Сакратас". Сабраўся на гэты раз цэлы тузін інтэлектуалаў зь Менску, Горадні, Беластоку, Варшавы, Будапэшту, Бэрліну і Карлсруэ. Шмат бывалых, але некаторыя прыехалі і першы раз. Сам гаспадар імпрэзы Сакрат Яновіч назваў гэта: "Сустрэчай сяброў беларускай культуры. Трэба яе ратаваць, бо затопчуць..."

Пытаньні якія ўздымаліся, гэта стан беларускай культуры – літаратуры, гісторыі, мастацтва, традыцыі. Таксама ў рамках Трыялёгу паказалі выставы сваіх новых твораў мастак Л. Тарасэвіч, фатограф П. Грэсь, выступіў сьпявак З. Вайцюкевіч.

Мэта сяброў "Вілы Сакратас" – каб гэта акцыя паўплывала на гістарычную тоеснасьць усяго рэгіёну Беласточчыны. І гэта не пустыя словы. Акцыі пад эгідай беларускай культуры, што адбываюцца тут з году ў год, прыцягваюць усё больш наведвальнікаў ня толькі з навакольных гарадоў і вёсак, але зь Беларусі і іншых краінаў Эўропы. Знакамітае "Басовішча" зьбірае лепшых беларускіх музыкаў і тысячы гледачоў. За ім ідзе "Сяброўская бяседа", якая зьбірае ўжо аматараў фальклёру.

Адбываецца гэта ў вялікай меры намаганьнямі "трох белавежскіх зуброў", людзей з абвостранай нацыянальнай самасьвядомасьцю – сусьветна вядомага мастака, прафэсара Лёніка Тарасэвіча, пісьменьніка і грамадзкага дзеяча Сакрата Яновіча і рэдактара "Czasopis", дырэктара мясцовага дому культуры Юркі Хмялеўскага.

Фактычна яны зрабілі зону цалкам свабоднай культуры, альтэрнатыўнай афіцыйнай лукашэнкаўскай. І гэта факт. Менавіта такой і павінна быць сучасная беларуская культура, вольная ад усялякай цэнзуры, культура, якая спалучае ў сябе традыцыі і наватарства.

Чарговы юбілейны нумар альманаху «Annus Albaruthenicus», які выдае Таварыства па выніках спатканьня, будзе незвычайным. У інтэрнэтаўскай вэрсіі ён будзе гатовы ўжо гэтай восеньню. Як заўсёды беларускія тэксты будуць у ім перакладзеныя на эўрапейскія мовы, эўрапейскія – на беларускую. А друкаваны варыянт пойдзе ў цэнтры культуры па усёй Эўропе.

*Алесь МАЛАХОЎСКІ*

Bielarus561C.qxd 10/8/2009 10:45 PM Page 6



# Фронт, апазыцыя, калябарацыя

*Заканчэньне з бачыны 1*

* * *

Сёлета пасьля старту "Ўсходняга партнэрства" і гешэфту Эўропы з антыбеларускім рэжымам пачалася перабудова вікаўскай падстаўной апазыцыі. Апазыцыйнае асяродзьдзе скупляецца рэжымам праз Мілінкевіча (пры спрыяньні і згодзе Эўропы). Здаецца, ініцыятары былой "новай хвалі" нарэшце гэта зразумелі. Пачуўся ціхі лямант. Нават вечны блытанік і раскольнік Фронту Юры Хадыка артыкул супраць Мілінкевіча напісаў.

Усё гэта здавалася-б сьмешным, калі-б не было такім сумным. Бо ўзьняла Мілінкевіча на паверхню якраз "новая хваля", яе прыхільнікі. Яны выцягнулі Мілінкевіча ў апазыцыйную палітыку і выставілі кандыдатам у прэзыдэнты на выбарах 2006 году (між іншым, крок у крок згодна маскоўскага пляну пуцінскай каманды Паўлоўскага). Можа яны тады не ведалі, што рабілі? Магчыма, бо нават не цікавіліся біяграфіяй кандыдата (вельмі вымоўнай, дарэчы). Праўда, для людзей, якія раней падтрымалі чэкіста У. Ганчарыка, гэта не абавязкова.

Мілінкевіч паспрыяў развалу нацыянальна-дэмакратычнага руху па новай (заходняй) тэхналёгіі. Гэтая тэхналёгія простая, як кол, і называецца яна – грошы. У другой палове 90-х ён пакідае кар'ерную кіруючую пасаду ва ўладзе і йдзе ў "апазыцыю", ачольвае рэсурсны цэнтар "Ратуша", праз які праходзілі вялікія грашовыя плыні для НДА і інш. Праз "Ратушу" пачалася скупка БНФ. За кароткі час гэтая "Ратуша" разбэсьціла грашыма і паспрыяла развалу магутнай гарадзенскай арганізацыі Народнага Фронту. На Гарадзеншчыне ў нас цяпер амаль нічога не засталося. Пасьля расколу частка структураў прымкнула да "новай хвалі", частка самаліквідавалася.

У 2001 годзе Мілінкевіч узначальваў штаб С. Домаша – гарадзенскага намэнклятуршчыка, якога выставілі на выбары спэцыяльна супраць мяне (зьбіраўся гуляць на маім полі).

У 2006 годзе, будучы кандыдатам на прэзыдэнцкіх выбарах, Мілінкевіч дакладна выканаў плян пуцінскай групы Паўлоўскага па забесьпячэньні легітымнасьці выбараў і перамогі Лукашэнкі. (Сьведама ці не сьведама тое зроблена – гэта ўжо іншае пытаньне).

19 сакавіка 2006 г. ён акуратна справіўся зь непрадбачанай у Маскве сытуацыяй – адвёў з плошчы перад прэзыдэнцкай рэзыдэнцыяй 40 тысячаў людзей у іншае месца, да савецкага "вечнага агню" на Круглую плошчу. Словам, ціха патушыў пратэстны ўздым. Тое-ж самае ім было зроблена праз тыдзень – 25 сакавіка. (Потым пра гэта ён сам сказаў у інтэрв'ю тэлебачаньню "Эўраньюс" на францускай мове: маўляў, трэба было спыніць стыхійны пратэст).

* * *

Пасьля расейскай агрэсіі на Грузію летась Лукашэнка заявіў, што гэтай апазыцыі засталося існаваць шэсьць месяцаў – максымум два гады. Ведаючы псыхіку ўзурпатара, можна было зразумець, што ёсьць плян нейкай ракіроўкі і замены гэтай вікаўскай квазі-апазыцыі на іншую (магчыма, па крамлёўскім ўзоры). Так яно цяпер і выглядае. Мне гэта стала зразумела ў пачатку траўня сёлета ў Празе пасьля размовы зь Мілінкевічам.

Мілінкевіч выступае цяпер у якасьці апазыцыйна-дэмакратычнага лабі рэжыму Лукашэнкі перад Эўразьвязам. Эўразьвязу, які пасьля расейскай агрэсіі на Грузію, агаліў сваю прагматычную палітыку адносна Беларусі, вельмі патрэбная была такая фігура, як Мілінкевіч. Трактуючы яго як лідэра дэмапазыцыі, эўрапрагматыкі могуць трансляваць свае інтарэсы адносна рэжыму Лукашэнкі, нібыта зыходзячы з пазыцыяў і меркаваньня "беларускай апазыцыі".

Ну, напрыклад, напісаў нядаўна адзін памочнік з групы Мілінкевіча фразу: "дзеяньні Лукашэнкі па абароне сувэрэнітэту важнейшыя, чым палітычная лібэралізацыя". Для эўрапрагматыка гэта пас у штрафную пляцоўку. Эўропе, каб утрымаць лукашысцкі рэжым у сфэры сваіх інтарэсаў, трэба нешта вырашыць з санкцыямі аб "неўязных" (тэрмін у лістападзе), трэба неяк заплюшчыць вочы на рэпрэсіі, на парушэньні правоў людзей, на адсутнасьць заяўленай лібэралізацыі. І тут якраз такое меркаваньне (цытата) ад "апазыцыі". Сам-жа Эўразьвяз ня можа такое казаць. Але цяпер можна пагадзіцца з ацэнкай "беларускай апазыцыі" і працытаваць яе.

Адзначу, што сытуацыя з гэтай цытатай і дэфініцыяй не такая простая і патрабуе тлумачэньня. Калі выключыць з яе слова "Лукашэнка", то сьцьвярджэньне правільнае – сувэрэнітэт важнейшы. З "Лукашэнкам"-жа ўвесь сэнс валіцца. Бо самай вялікай пагрозай сувэрэнітэту ёсьць сам Лукашэнка і ягоная антынацыянальная палітыка. Ён стварыў і стварае гэтую пагрозу. Другое: дзеяньні Лукашэнкі накіраваныя не на абарону сувэрэнітэту, а на захаваньне сваёй узурпаванай улады любым спосабам (бо пад пагрозай уласная скура). Улада-ж не вісіць у паветры, яна грунтуецца на дзяржаве і існуе ў ёй. Таму, ратуючы ўладу, узурпатар абапіраецца на дзяржаўны сувэрэнітэт. Але ўспомнім, калі ў 90-х Лукашэнка плянаваў скочыць у Крэмль, ён казаў адкрыта з тэлеэкрана: "Сувэрэніцет – эта ерунда".

Каб забясьпечыць і суверэнітэт, і палітычную лібэралізацыю, трэба скінуць Лукашэнку.

У працытаванай фразе, дарэчы, квінтэсэнцыя, галоўны сэнс "апазыцыйнага" лабіяваньня Лукашэнкі перад Брусэлем ва "Ўсходнім партнэрстве". Сутнасьць такая: прымайце Лукашэнку такім, як ён ёсьць, безь аніякіх умоваў і патрабаваньняў аб лібэралізацыі, інакш ён здасца Расеі, і Расея вам пакажа.

Нездарма ўзурпатар двойчы пахваліў Мілінкевіча. Людзі, якія перад гэтым не вылазілі з Масквы, згіналіся перад Маркавамі ды Караганавымі, сьведчылі пра сваю адданасьць Расеі і пра адсутнасьць у беларускай апазыцыі антырасейскіх настрояў (Мілінкевіч), цяпер навучыліся выкарыстоўваць расейскую пагрозу, каб падтрымаць узурпатара ва ўладзе за ягоную нібыта "дзейнасьць" па абароне сувэрэнітэту.

Галоўнае фінансаваньне лабісцкай апазыцыі ідзе хутчэй за ўсё ад рэжыму Лукашэнкі. Зараз прыцэньваюцца да маладых, гандлюючы лейтэнантаў з былой "новай хвалі" і г. д. Адбіваецца падрыхтоўка да старой ролі, якую Мілінкевіч зьбіраецца зноў сыграць у прэзыдэнцкай кампаніі.

* * *

У часткі разбурэньня структураў Мілінкевіч даволі пасьпяховы. Гэта зьвязана найперш зь ягонай "грашовай мэтадалёгіяй". Тыя, хто пакепліваюць зь ягонай нібыта "пасрэднасьці" (як яны думаюць), знаходзяцца на памылковай дарозе. Як і тыя, хто пацяшаюцца зь нязразьвітасьці і бескультур'я Лукашэнкі (а ён ужо 15 гадоў куражыцца над нацыяй і культурай). Словам, вопыт лукашызму – гэта нагода беларусам сур'ёзна задумацца над прыродай улады і над адказнасьцю перад Айчынай за свае рашэньні.

Што датычыць "мэтадалёгіі", то асобы, якія ў дасягненьні палітычнай мэты выкарыстоўваюць рычаг грошай, заканамерна развальваюць існуючае асяродзьдзе, зь якога лепяць свае дачасныя групы.

Цалкам верагодна, што лабісты рэжыму скупяць добрую частку вікаўскай апазыцыі і прагматыкаў, і фрондзу, і ўсіх тых, хто (перафразуючы расейскага паэта) "ищет робкими глазами, кто бы им помог упасть".

Трэба дастаткова ўважліва сачыць за паводзінамі лабісцкай групоўкі. Гэта цяпер рэальная пагроза беларускаму руху. Яе ўплыў можа стаць тормазам у змаганьні за свабоду, волю і ідэалы, за культурную будучыню нацыі.

На мой погляд, першае, што трэба зрабіць у дачыненьні да "лабісцкай апазыцыі" – гэта назваць рэчы сваімі імёнамі. У істоце сваёй – гэта ёсьць калябарацыя з рэжымам на аснове прагматызму "рэаль-палітык". Гэта калябарацыя, але не апазыцыя. Трэба так і называць, не прышпільваць да іх паняцьцяў і словаў, якім яны не адпавядаюць.

Звычайна калябарацыя з адыёзным рэжымам (калі яна не выклікана мэтавым заданьнем) вынікае з палітычнай пазыцыі, якая дрэнна пахне, дрэнна стыкуецца з маральлю, годнасьцю, павагай, і прадыктаваная слабасьцю палітычнай альтэрнатывы. Калябарацыя мае сваю мізэрную нішу для пазытыўных дзеяньняў. Але ў гэтай нішы нікчэмна мала можна чаго дасягнуць і ніколі нельга перамагчы.

Зь мінулага году пачалося бражэньне калябарацыі ў вікаўскай апазыцыі. Многія (асабліва з АГП) кінуліся да Лукашэнкі, наперабой прапаноўваючы свае паслугі дыктатарскай уладзе (з АГП нават на прэм'ера набіваліся: а такія-ж былі "змагайцы").

Лукашэнка, вядома, у прэм'еры нікога ня ўзяў. Аказалася, што ўсіх ціхенька абагнаў Мілінкевіч. Такая сытуацыя цяпер пасьля "новай хвалі" ў гэтым асяродзьдзі.

* * *

Сытуацыя выклікана зьменай арыентацыі Эўразьвязу на супрацоўніцтва з рэжымам Лукашэнкі. Гэтым тлумачыцца, чаму прадстаўнікі вікаўскай апазыцыі, залежныя ад Брусэля, пайшлі прасіцца на службу ў варожы рэжым. Дзіўна, але яны не зразумелі нават жыцьцёвых абставінаў, што тых, каго дыктатар адзін раз вытурыў, тых назад не бяруць (гумовасьць іхнай этыкі неверагодная). Тым часам, калі такіх гастралёраў у "апазыцыі", як генэрал Фралоў ці Нісьцюк, ніхто з уладнай каманды не выганяў, то яны туды й вярнуліся, "папрацаваўшы" (ды пафрандаваўшы) крыху.

Мілінкевіч-жа чалавек адносна сьвежы ў рэжымным асяродзьдзі (хоць даўно не чужы), ня раз пасылаў свае прапановы рэжыму (пісаў лісты, звароты, запрашэньні на сьвяты), мае доступ у заходнія кабінэты, словам, падыходзячая фігура для стварэньня новай прыдворнай апазыцыі крамлёўскага кшталту.

Лабісцкая апазыцыя грунтуецца на меркаваньні, што трэба ўцягнуць рэжым у палітычна-эканамічныя дачыненьні з Захадам. Гэта паступовa павінна (як яны спадзяюцца) прывесьці да рэдукцыі рэжыму, да лібэралізацыі ў эканоміцы і ўнутранай палітыцы.

Пастаноўка такой задачы ў прынцыпе не пазбаўлена сэнсу, мае фармальнае абгрунтаваньне. Дзьверы на Захад мусяць быць адчыненымі, кантакты на чалавечым і эканамічным узроўні павінны быць (і, магчыма, будуць). Але вось на палітычным узроўні (які тут ёсьць вызначальным) ня будзе прынята нічога, што хоць ускосным чынам здольнае пагражаць уладзе ўзурпатара. Гэта добра відаць ад самага пачатку новай заходняй палітыкі, і лабісты вымушаныя абслугоўваць такую пазыцыю.

Лукашэнка цягне час і груба балянсуе паміж Расеяй і Эўразьвязам, чакаючы эканамічнай направы ў сьвеце (канца крызісу). Але гэты расьцягнуты час ёсьць страчаны час Беларусі. Антынацыянальная палітыка рэжыму не спыняецца ні на хвіліну. І чым больш гэты час расьцягнецца, тым больш будзе зьнішчэньняў нашай нацыянальнай існасьці і нашай культуры. (Нагадаю, што русіфікацыя і ліквідацыя беларускай нацыянальнай культуры, улучна з мовай, ёсьць, як раней прызнаўся сам узурпатар, – галоўнай ідэалягічнай задачай ягонай улады.)

Акрамя таго, амбівалентныя выкіды сьвядомасьці ўзурпатара і балянсаваньне антыбеларускага рэжыму паміж Расеяй і Эўропай – вельмі небясьпечная палітыка (асабліва ў шулерскім выкананьні Лукашэнкі). Яна можа скончыцца чарговым падзелам Беларусі (на гэты раз эканамічным), калі Масква і Эўразьвяз дамовяцца. А гэта цалкам верагодна і тым больш небясьпечна, таму што ў Беларусі няма на гэты час моцнай народнай беларускай апазыцыйнай сілы (няма больш моцнага БНФ).

Празаходні лабізм збанкрутаванага рэжыму без каштоўнасных умоваў аб дэмакратыі і культуры, улічваючы геапалітычную неабходнасьць, можна-б было яшчэ зразумець, калі-б ім займалася нейкая асобная прыўладная група (няхай сабе і калябаранцкая, быў-жа "дэмакрат" Гайдукевіч). Але тут падмена, тут справа йдзе аб стварэньні шырокай нібыта апазыцыйнай зьявы ў істоце сваёй скіраванай у тупік і на пабочную абслугу гэтага рэжыму. Гэта яшчэ горш, чым вікаўская апазыцыя, якая "змагалася" для паказухі.

* * *

Дзеля направы Беларусі, дзеля сьветлай і вольнай будучыні Бацькаўшчыны няма іншай вынікoвай дрогі, як апора на самых сябе, на свой народ, на сваю барацьбу, на сваю творчасьць, мову, культуру, гісторыю, працу і сілу. Трэба ўздымаць гэтую сілу, ствараць сваю магутнасьць. Трэба зрушыць рэжым зь мёртвай кропкі, перакуліць гэтую стабільнасьць цемры і ўзьняць наш Сьцяг.

Магчымасьці заўсёды ёсьць. Нельга жыць па сцэнары антынацыянальнага рэжыму. У 2011 годзе неабходна скарыстаць народны сцэнар і байкатаваць фальшывае галасаваньне.

Зразумела, што "лабісцкая апазыцыя" стане той групай, якая найбольш будзе выступаць супраць байкоту фальшывых незаконных выбараў Лукашэнкі. (Паўтаруся яшчэ раз: як-бы хто ні галасаваў, галасы палічаць толькі Лукашэнку; ня будзе выбараў ні справядлівых, ні дэмакратычных, ні законных; узурпатару нельга прайграць, ён далёка зайшоў і, каб утрымаць уладу, ён скарыстае ўвесь арсенал). Якая роля будзе спадара Мілінкевіча ў гэтых выбарах, лёгка прадбачыць.

Байкот праводзіць трэба. Прытым актыўны байкот з прапагандай і патрабаваньнямі. Ужо цяпер трэба рыхтавацца, не марнаваць час, не спадзявацца на станоўчыя рашэньні рэжыму і ўзурпатара. Станоўчых рашэньняў ня будзе (калі што ўзьнікне, дык толькі ашуканства).

Байкот незаконных выбараў Лукашэнкі мае тую асаблівасьць, што калі-б яго ўдалося правесьці як актыўнае мерапрыемства, то гэта магло-б паспрыяць аднаўленьню сапраўднага Беларускага дэмакратычнага руху ў краіне. Трэба рабіць тое, што зрушыць грамадзтва на разьвіцьцё, на адраджэньне Беларусі.

*24 верасьня 2009 г.*

Bielarus561C.qxd 10/8/2009 10:45 PM Page 7




# Весткі й Паведамленьні

**Нью-Ёрскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня**

**Viestki j Paviedamlenni**

**Belarusan American Association, Inc.**

✉ 166-34 Gothic Drive, Jamaica, N.Y. 11432 Сусьветнае сеціва: *www.baza-belarus.org* **№ 10 (525)**


# Верасьнёўскі сход аддзелу БАЗА ў Нью-Ёрку

Чарговы сход Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА адбыўся 13 верасьня. Напачатку сходу старшыня аддзелу Віталь Зайка азнаёміў прысутных з падзеямі ў Беларусі за мінулы месяц.

## Пра падзеі ў Беларусі

У прыватнасьці ён распавёў пра зьезд Партыі БНФ і зьмену на ім кіраўніцтва Партыі БНФ, у выніку якой партыю ўзначалілі А. Янукевіч, І. Лялькоў і Р. Кастусёў. Была згадана прапанова ПАРЭ аднавіць для Беларусі статус спэцзапрошанага на Парлямэнцкую Асамблею Рады Эўропы, які быў зьняты ў 1996 г. пасьля разгону Лукашэнкам парлямэнту. З гэтым зьвязаны нядаўні таямнічы візыт былога міністра замежных справаў Нямеччыны Г.-Д. Гэншара ў Менск. Тымчасам Лукашэнка сустрэўся з прэзыдэнтам Вэнэсуэлы Чавэсам, які выехаў у турнэ па недэмакратычных краінах з спробай змайстраваць антыамэрыканскі альянс і заявіў у Менску, што Вэнэсуэля прызнае Паўночную Асецію і Абхазію, якія былі сілком аддзеленыя ад Грузіі ў выніку расейска-грузінскай вайны 2008 г. У Менску адбыліся акцыі пратэсту супраць сумесных беларуска-расейскіх манэўраў “Захад”, у рамках якіх у Беларусь прыбыло некалькі тысяч расейскага войска. На Вялейшчыне мясцовыя ўлады зьнішчылі крыж на месцы расстрэлу Расьціслава Лапіцкага, удзельніка паваеннага антысавецкага супраціву ў Беларусі. Гэта ўжо ня першая спроба ўладаў вынішчыць памяць пра патрыёта і змагара за вольную Беларусь.

## Рэфэрат на 480-годдзе Літоўскага Статуту

Затым да 480-годзьдзя Літоўскага Статуту сп. Зайка выступіў з рэфэратам, зазначыўшы важнасьць Статуту для беларускай нацыянальнай гісторыі і культуры. Літоўскі Статут – адна зь вяршыняў палітычнай і юрыдычнай думкі тагачаснай Эўропы, стаў вынікам працы выбітных дзеячоў ВКЛ, сярод якіх былі сам вялікі князь і кароль Жыгімонт Стары, канцлер Гаштольд і, цалкам верагодна, Францішак Скарына. Статут уступіў у дзеяньне 29 верасьня 1529 году і аб’яднаў у сабе нормы дзяржаўнага, адміністрацыйнага, грамадзянскага, сямейнага, крымінальнага, судова-працэсуальнага ды іншых галінаў права. Статут падтрымліваў правы жыхароў Вялікага Княства і надаваў ім прыярытэт у параўнаньні з правамі жыхароў іншых краінаў, у тым ліку Кароны Польскай, і забараняў вялікаму кніязю надаваць землі й прывілеі замежнікам. Літоўскі Статут таксама базаваўся на прынцыпе адзінства права і прыярытэце пісанага права. Ён абвяшчаў таксама прынцыпы публічнасьці правасудзьдзя, роўнасьці бакоў у судовым працэсе, уводзіў права на абарону з удзелам адваката. Разам з тым Статут быў дакумэнтам сваёй эпохі, працаваў на захаваньне прывілеяў магнатаў і адстойваў іх правы ў дачыненьнях з вялікакняскай уладай. Пры гэтым Статут даваў пэўныя правы і гарантыі правасудзьдзя сялянам, гэбраям ды іншым непрывеліяваным групам грамадзтва. Такім чынам. Статут стаў першай Канстытуцыяй старабеларускай дзяржавы, што вызначыла структуру і характар дзейнасьці ворганаў дзяржаўнай улады, а таксама гарантавала правы розных групаў насельніцтва. Вялікі князь Жыгімонт, загадаў раздрукаваць Статут, аднак друкаваныя асобнікі навукоўцамі не зафіксаваныя. Захаваліся 4 сьпісы першага Літоўскага Статуту 1526 г. на старабеларускай мове і некалькі асобнікаў у перакладзе на лацінскую і польскую мовы.

## Асобнік Статуту ў Бібліятэцы Ф. Скарыны

Сп. Антон Шукелойць распавёў з нагоды рэфэрату па Літоўскім Статуце пра асобнік Статуту, які захоўваецца цяпер ў Беларускай бібліятэцы імя Ф. Скарыны ў Лёндане. Сп. Шукелойць зазначыў: “Акупацыйныя нямецкія ўлады стварылі сыстэму школьнай адукацыі, дзе выкладаньне было па-беларуску. Кіраваў гэтай сыстэмай школьны аддзел, які мясьціўся ў Менску на вуліцы Камсамольскай, якая была перайменаваная ў вуліцу Алеся Гаруна. У школьным аддзеле, дзе працаваў а. Вінцэнт Гадлеўскі, быў рэфэрэнт Сівіца, немец польскага паходжаньня. Сівіца займаў даволі высокую пасаду ў нямецкай адміністрацыі і меў немалую ўладу. Ён недзе знайшоў асобнік Літоўскага Статуту, які паходзіў ці зь бібліятэкі, ці з архіву. Рэч у тым, што напачатку вайны шмат музэйных і бібліятэчных калекцыяў былі разбомбленыя, часткова разрабаваныя, і страты таго часу так ніколі не былі кампэнсаваныя. Дык вось Сівіца схаваў гэты асобнік у стале адной фальксдойчкі. Падчас бамбаваньня пакой, дзе стаяў той стол, быў часткова разбураны. Пазьней Сівіца запатрабаваў асобнік Статуту сабе назад.” Далей сп. Шукелойць распавёў, што скантактаваў з Радаславам Астроўскім, які быў прадстаўніком пры Генэральным камісары, і праз Астроўскага Статут трапіў у беларускія рукі, і далейшыя спробы немцаў знайсьці яго ня мелі выніку. Перахоўвалі асобнік Статуту сп. А. Шукелойць, які быў у той час загадчыкам Беларускага музэю, сьв. пам. Леанід Галяк, які працаваў акруговым судзьдзём Менскай акругі, і жонка яго Раіса Галяк, што працавала ў школьным інспэктарыяце. Перахоўваць Статут было мажліва дзякуючы таму, што ў Беларускім музэі было шмат іншых рукапісаў і старадрукаў. Дарэчы, цікава, што ў гутарках генэральны камісар В. Кубэ даказваў, шо дырэктар музэю мусіць ведаць дыпляматыку (тэорыю і практыку досьледаў дамоваў, грамат ды іншымі старажытных дакумэнтаў) і палеаграфію (разуменьне зьнешніх прыкметаў рукапісаў для датаваньня і атрыбуцыі). Затым асобнік Статуту прайшоў ўсе шляхі беларускагаг эміграната: эвакуацыю зь Менску, туляньні па Ўсходняй Эўропе, Ды-Пі-лягеры. Напачатку 1950-х гадоў Статут трапіў у Амэрыку, і ўжо адтуль быў перададзены ў Беларускую Бібліятэку імя Францішка Скарыны ў Лёндан, дзе і захоўваецца дасюль.

## Польскасьць каталікоў у Беларусі

Сп. В. Зайка згадаў, што Статуту забараняў жыхарам Польшчы мець маёмасьць ці сяляцца ў ВКЛ. Таму масавых міграцыяў палякаў ніколі не было, і пераважная большасьць тых, хто сёньня лічыцца ў Беларусі палякамі, ёсьць нашчадкамі беларусаў і ў меншай ступені латгалаў і летувісаў, якія трапілі пад польскія рэлігійна-культурніцкія ўплывы. Гэта паказвае, што і сёньня Літоўскі Статут ня страціў сваёй вартасьці ў надзённых пытаньнях нацыянальнага разьвіцьця беларусаў.

У сувязі са згадкай аб “польскасьці” каталікоў у Беларусі сп. А. Шукелойць адзначыў, што за выняткам прыезду паасобных дзеячаў у старадаўнія часы, адзінай значнай міграцыяй палякаў у Беларусь было асадніцтва – надзяленьне зямлёю вэтэранаў баявых дзеяньняў за аднаўленьне незалежнасьці Польшчы ў 1917-1920 гг., якія складалі зусім нязначную колькасьць насельніцтва. Сп. Шукелойць таксама прыгадаў свой досьвед удзелу ў перапісе насельніцтва тагачаснай Польскай рэспублікі, пасьля якога ён і шэраг вучняў гімназіі былі пакінутыя на другі год у 8-й клясе гімназіі за тое, што прынесьлі падпісныя лісты, дзе большасьць апытаных ў Ашмянскім павеце былі запісаныя беларусамі. Справа ў тым, што па ўмовах перапісу мова была вызначальнай пры рэгістрацыі нацыянальнасьці. Пераважная большасьць жыхароў павету штодня гутарыла па-беларуску і ўжываньне польскай мовы было абмежавана да пацераў, але фіксацыя беларускай мовы як “ендзыка ойчыстэго” не спадабалася старасту ды іншым польскім чыноўнікам.

Спн. Алла Орса-Романо ў дадатку да тэмы адзначыла, што часта блытаюць нацыянальнасьць зь веравызнаньнем. калі ў Беларусі часьцяком каталіцтва атаясамляецца з польскасьцю, і ўзгадала паездку танцавальнай групы “Васілёк” у Беларусь, падчас якой сустракаліся людзі з адной сям’і, адныя зь якіх лічылі сябе палякамі, а другія беларусамі, прычым палякамі менавіта дзеля каталіцкай рэлігіі, а ня мовы, культуры або этнічнасьці.

Свае засьцярогі ў стасунку да польскіх уладаў і неабходнасьць быць пільнымі ў справе ўзаемадачыненьняў з Польшчай выказаў а. Юры.

## Рознае

Старшыня Галоўнай Управы БАЗА Вячка Станкевіч падаў кароткую заўвагу пра пытаньне аб паляках у перапісе, а затым спыніўся на дзейнасьці Галоўнай Управы. Былі распрацаваныя праекты сяброўскіх картак для тых, хто ўваходзіць у БАЗА. Яны маглі-б быць акрамя пасьведчаньня аб сяброўстве таксама ідэнтыфікацыйным дакумэнтам, з фатаздымкам, для агульнага ўжытку ў розных сытуацыях. Затым сп. Станкевіч сказаў: “Што сталася апошнім часам? Сакратар аддзелу ў Нью-Ёрку Валянціна Якімовіч распаўсюдзіла паскудныя зьвесткі пра мяне. Я ёй прабачаю гэта, а што наступна — хай вырашае арганізацыя.”

Спн. Валянціна Якімовіч паведаміла пра запросіны на 60-годзьдзе БАЗА музыкаў зь Беларусі, а ў адказ на словы сп. Станкевіча сказала: “Сп. Станкевіч, вы зьяўляецеся Старшынём Галоўнай Управы 2 гады, а я ўжо 10 год сакратар Нью-Ёрскага аддзелу. Лічу сябе сумленным чалавекам, за гэты час ніхто не ўпікнуў, што я распаўсюджваю несапраўдныя зьвесткі. Тое, што я гавару пра вас, зыходзіць з маёй душы і майго сумленьня. Калі вы кажаце, што мне прабачаеце, то я вашыя дзеяньні вам не прабачаю”.

Далей адбылося знаёмства з гасьцямі аддзелу, якія коратка праспавялі пра сябе і сваю вучобу або працу. Былі зробленыя аб’явы і паведамленьні, у тым ліку пра надыходзячае сьвяткаваньне 60 год БАЗА, якое будзе 18 кастрычніка і пра фэст, які будзе праводзіць царква ў Брукліне 4 кастрычніка.

***Віталь ЗАЙКА***

---

## Наступны сход

**нью-ёрскага аддзелу БАЗА адбудзецца**
**8 лістапада 2009 году**
**ў Фундацыі імя П. Крэчэўскага па адрасу:**
***166-34 Gothic Drive, Jamaica, NY 11432***
**Даезд цягнікам падземкі F да прыпынку 169th St; адтуль 2 блёкі да скрыжаваньня 167-й вул. і Готык Драйв.**
**Пачатак сходу а 1:00 папаўдні.**

---

**Уплаты ў нью-ёрскі аддзел шліце на адрас:**
*Belarusan American Association*
*P. O. Box 230249*
*Brooklyn, NY 11223*
**Чэкі выпісвайце на**
*Belarusan American Association.*

---

Сябры Рады дырэктароў Фундацыі імя П. Крэчэўскага зьвярнулася ў Прэзэдыюм Рады БНР з просьбаю паспрыяць у вырашэньні канфлікту, які паўстаў на апошнім паседжаньні Рады дырэктароў Фундацыі 21 чэрвеня 2009 году, калі з грубымі парушэньнямі Статуту гэтай установы быў абраны новы старшыня, а тыя сябры Рады дырэктароў (тры зь пяці), якія патрабавалі не парушаць закон, былі зьнятыя са сваіх пасадаў і замененыя іншымі асобамі, больш ляяльнымі да новага старшыні..

Сябры Рады дырэктароў патрабуюць усе зьмены ў кіраўніцтве Фундацыі рабіць у дакладнай адпаведнасьці з патрабаваньнямі Статуту.

Bielarus561C.qxd 10/8/2009 10:46 PM Page 8



## Нашая фанатэка

# Натальля Арсеньнева вяртаецца ў Беларусь. На музычнай хвалі...




Усталічных слухачоў ужо ўвайшло ў добрую звычку тое, што кожная заўважная музычная прэм'ера дыскаў нацыянальнай скіраванасьці адбываецца ў культурным цэнтры пры менскім Чырвоным касьцёле св. Алены і Сымона. Вось і чарговая імпрэза – прэзэнтацыя альбому-прысьвячэньня творчасьці эміграцыйнай паэткі Натальлі Арсеньневай "З крывіцкай сям'і" сабрала паўнюткую залю прыхільнікаў высокага паэтычнага слова, сучаснай беларускай музыкі. Нагадаю, гэты мэмарыяльны дыск быў выдадзены ў рамках серыі "Беларускі Музычны Архіў", які некалькі гадоў таму быў заснаваны выдаўцамі з БМAgroup.

У вядомай канцэртнай залі ўзьнёсла гучалі неўміручыя радкі паэзіі гарачай патрыёткі Беларусі, актыўнай дзяячкі эміграцыйнага руху беларусаў у Злучаных Штатах Амэрыкі Натальлі Арсеньневай. На яе вершы ствараліся шматлікія кампазыцыі, якія былі прадстаўленыя пад час канцэрту. Ня ўсё з таго, што прагучала ў гэты дзень на прэзэнтацыі ўяўляла стопрацэнтовае адлюстраваньне паэтычнага сьветаўспрыманьня Арсеньневай, але большасьць музычных твораў можна было-б назваць гарманізуючымі з паэтыкай яе вершаў, і таму былі вельмі цёпла сустрэтыя сталічнай публікай. Маю на ўвазе "жывыя" кампазыцыі на вершы Н. Арсеньневай ў выкананьні гуртоў "РОСТРА", Яна Жанчака і ягонай каманды "In Search For", ну і, канешне, гэдляйнэра апошніх прэзэнтацый "Беларускага Музычнага Архіву" лідэра гурта P.L.A.N. Андрэя Плясанава, сьпевы якога выклікалі самыя бурныя авацыі. Асабліва пад час выкананьня цудоўнай кампазыцыі "Сонца залатое"...

Дынамічная і рознабаковая ў музычным пляне прэзэнтацыя прымусіла слухачоў і музычных аглядальнікаў вызначыць дыск-прысьвячэньне творчасьці Натальлі Арсеньневай "З крывіцкай сям'і" як самы заўважны рэліз нацыянальнай фанагарафіі апошняга часу. Дыск – дзясяты па ліку ў гэтай найбуйнейшай музычнай сэрыі, заснаванай выдаўцамі БМAgroup. І разам з дыскамі, прысьвечанымі творчасьці С. Манюшку, М. Забэйду-Суміцкаму, Л. Геніюш, С. Новіку-Пяюну, іншым асобам мінулай і сучаснай музычнай культуры краіны, гэты альбом дапаўняе беларускі музычна-паэтычны пантэон...

Ягоную праграму распачынае інструмэнтальная п'еса былога ўдзельніка рок-гурта "Сузор'е", цяпер жыхара Нью-Ёрку Аляксандра Растопчына. Аляксандар прадставіў сваю п'есу з новага альбому "Роднае" паводле гімну М. Равенскага на верш Н. Арсеньневай "Магутны Божа". Гэта глыбокі па сваёй сутнасьці твор у акустычна-гітарных фарбах перадае піетэт музыкі да арыгіналу. Музычная навэля А. Растопчына ўдала гарманіруе з іншымі вэрсіямі знакамітага беларускага рэлігійнага гімну, якія выконваюць музыкі праекту "Я нарадзіўся тут" і Данчык. Будзем спадзявацца, што для А. Растопчына ўдзел у аналягічных праектах будзе тым штуршком, які зблізіць яго зь дзеячамі беларускай эміграцыі ў ЗША, надасьць энэргіі дзеля працы на карысьць нацыянальнай культуры.

Што тычыцца твораў, прадстаўленых на дыску ў выкананьні знакамітага Багдана Андрусышына, то яны на доўгія гады застаюцца ў беларускай культуры (як эміграцыйнай, так і ўсёй незалежнай) узорнымі. Бязь іх нельга ўявіць больш-менш значны музычна-паэтычны праект, як ў Беларусі, так і за яе межамі.

З прыемных нечаканасьцяў дыску хацелася-б адзначыць дэбют у якасьці камэрнай сьпявачкі знанай фальклёрнай выканаўцы Тацьцяны Матафонавай. Асабліва ўдаюцца Тацьцяне рамансы на вершы Н. Арсеньневай ("Вясновы вечар", "Знае сэрца") і творы, блізкія да фальклёрных. Напрыклад, калыханка "Сьпі, сыночак". Усе гэтыя творы пакладзеныя на музыку Э. Зубковічам. Толькі што пабачыў сьвет сольны альбом фальклёру ў выкананьні Т. Матафонавай і яе сяброў пад назвай "Пяршак", а цяпер ужо ёсьць пільная патрэба выданьня новага дыску зь песьнямі і рамансамі на вершы Н. Арсеньневай.

Яшчэ адная нечаканасьць гэтага альбому – трэк ад вядомага менскага мультыінструмэнталіста і гукарэжысэра Ўладзімера Зайчанкі. Ён шмат гадоў эксьпэрымэнтуе з гукам у сваёй хатняй студыі. І хоць у ягоным творчым багажы ёсьць мінімалістычны альбом на вершы А. Мінкіна, музыка толькі зараз вырашыў прадставіць свой беларускамоўны трэк на суд слухачоў. Некаторыя крытыкі ўжо пасьпелі назваць кампазыцыю У. Зайчанкі "Шчасьце" самым заўважным "траблам" гэтага дыску. Магчыма, гэтай кампазыцыі не хапае паэтычнасьці і бляску ў запісе, а самому Ўладзімеру дакладнасьці беларускага вымаўленьня, але галоўнае тое, што ў музыкі за доўгія гады зьявілася жаданьне рабіць нешта значнае для айчыннай культуры. І гэтае жаданьне – прыкмета таго, што хутка творы Ўладзімера могуць прыцягнуць увагу слухачоў сваёй неардынарнасьцю і выканаўчай дасканаласьцю.

Я ўжо ўзгадваў пра тое, зь якім энтузіязмам прымалі творчасьць вядомага менскага барда і рок-музыкі Андрэя Плясанава. Маю на ўвазе кампазыцыю гурта P.L.A.N. "Сонца залатое", якую Андрэй прадставіў на гэтым дыску. Сёлета пад час паездак па Беларусі з прэзэнтацыяй нашай сумеснай з В. Мартыненкам кнігі "222 альбомы беларускага року і ня толькі..." Андрэй часьцяком падарожнічаў з намі і сьпяваў свае песьні. Пад час гэтых музычных вандровак нам даводзілася бачыць рэакцыю слухачоў на гэтую кампазыцыю. Для многіх зь іх, асабліва маладых, "Сонца залатое" стала своеасаблівым мастком да паэтычнага сусьвету Натальлі Арсеньневай. У кампазыцыі А. Плясанава захаваны дух паэзіі, віруе аптымізм сьветапогляду паэткі, яе неўміручая вера ў лепшае будучае Айчыны...

Вельмі пранікнёным і запамінальным атрымаўся твор на верш Н. Арсеньневай "У храм незямны", які выканаў культавы панк-рок-гурт "Голая Манашка". Мэлёдыю да твору стварыў лідэр "ГМ" Ф. Жывалеўскі. Па свайму зьместу песьню "У храм незямны" трэба аднесьці да своеасаблівых эмацыйных пікаў гэтага дыску. Калісьці нямецкі філязоф Фрыдрых Ніцшэ заўважыў: "Пішы крывёю, і ты будзеш ведаць, што кроў – гэта дух" ("Так сказаў Заратустра", "Мастацкая літаратура", 1994, пераклад В. Сёмухі). Сапраўды, здаецца, што гэтая песьня выпакутаваная музыкамі, а таму гранічна інтымная, скіраваная да ўнутранага сусьвету слухача. Да таго-ж, аранжыроўка твора даказвае, што музыкі здольныя адступіць ад некаторых панк-канонаў, калі патрабуецца найлепшым чынам данесьці да слухача літаратурны сэнс твора.

Іншым чынам гучаць творы на вершы Н. Арсеньневай у выкананьні Алесі Ўнукоўскай, з творчасьцю якой слухачы ўпершыню шырока пазнаёміліся з сэрыі дыскаў "Беларускі хрысьціянскі хіт". Спэцыфіка хрысьціянскіх папулярных сьпеваў адбілася і на музычнай афарбоўцы песьнь на вершы Н. Арсеньневай. Тут дамінуюць больш прымальныя для шырокіх слухацкіх колаў рытмы поп-музыкі. Але гэта зроблена прафэсійна і бачна, што Алеся напоўніцу выкарыстоўвае свой вопыт удзелу ў ранейшых музычных праектах.

У гэтых-жа музычных фарбах прадстаўлены творы ўжо вядомых беларускіх гуртоў "ZIGZAG" ("Ты мой родны край") і РОСТРА ("Я ішла"), для якіх удзел у аналягічных праектах – своеасаблівы палігон для выпрабаваньня новых ідэй і аранжыровак у галіне электрапопу і арт-року.



Сьпявае Т. Беланогая

Як заўсёды, па-жаночаму заглыбленымі застаюцца песьні ад Тацьцяны Беланогай. На дыску "З крывіцкай сям'і" прадстаўленая аўтарская песьня Тацьцяны на верш Н. Арсеньневай "Сьнежань". Як заўсёды, глыбіні кампазыцыі надае голас Тацьцяны – шчыры і трапяткі, прыцягальны, мэлядычны і гнуткі...

Вельмі каштоўную вартасьць гэтаму альбому надае ўводны артыкул знанага эміграцыйнага дзеяча, доктара гістарычных навук Янкі Запрудніка, а ў афармленьні дыску выкарыстана шмат рэдкіх здымкаў і дакумэнтаў. Сапраўдную гістарычнасьць дыску надаюць архіўныя запісы голасу спадарыні Арсеньневай, зробленыя ў 1993 годзе тым-жа Янкам Запруднікам. Цікава, што гэтыя запісы спантанныя, не выпраўленыя. А таму без залішняга прыаздабленьня перадаюць багаты ўнутранны і паэтычны сусьвет Натальлі Арсеньневай.

**Анатоль МЯЛЬГУЙ, музычны аналітык**

# "Вольны Тэатар" у Каліфорніі

Заключны трэці дзень выступаў Вольнага Тэатру ў REDCAT Тэатры Дысней Голу быў 4 кастрычніка. Сярод публікі на спэктакль прыйшлі 16 мясцовых беларусаў – большасьць паўднёва-каліфарнійскай суполкі БАЗА.

Гісторыя каханьня Анатоля і Ірыны Красоўскіх, потым зьнікненьне Анатоля, які падтрымаў апазыцыю рэжыму Лукашэнкі, была пададзена вельмі кранальна, на інтымным, пэрсанальным узроўні. Амаль кожны з нас, беларусаў, пазнаў у гісторыі гераіні самых сябе – дзяцінства бязь дзеда, сям'я, згвалтаваная Сталіным у 30-я, галеча 70-х і 80-х. Хіба таму было так балюча бачыць сцэны гвалту, якія адбыліся над гэтай сям'ёй, зь якой у сярэдзіне пьесы кожны ўжо атаясамляў сябе самога.

Гвалт, тупы, безасабовы, у чорнай масцы АМОНу, хадзіў і нахабна харкаў у актораў і глядачоў памаранчавымі лупінамі. Я сядзеў у першым разе і атрымаў гэтую памаранчовую лупіну з скрыўленага роту амонаўца проста ў твар. Усю другую палову пьесы сядзеў з камяком у горле і падазрона блiскучымі вачыма. Прабрала.

Акторка скамянелым голасам чытала радкі далейшай гісторыі зьнікненьня. Потым ішлі здымкі зьніклых людзей па ўсім сьвеце, гісторыя ксяндза Папялюшкі – дзеяча польскай Салідарнасьці, скрадзенага і забітага сілавікамі ў сацыялістычнай Польшчы. Старэйшая беларуска з нашай суполкі Кацярына Вініцкая распавяла, што Папялюшка меў беларускія карані. Апошнімі словамі ён маліўся за сваіх забойцаў і прасіў Бога дараваць ім.

У канцы пьесы заля ўстала і авацыямі выклікала актораў некалькі разоў. Таня Макаед падаравала акторцы, якая выконвала ролю Ірыны Красоўскай (Ганьне Саламянскай), букет з двух тузінаў белых і аднага тузіну чырвоных ружаў. Мікалай Халезін застаўся паразмаўляць зь беларусамі БАЗА пасьля пьесы ў кавярні тэатру, ня гледзячы на тое, што яму трэба было ляцець у Брусэль гэтым-жа ранкам.

Усе беларусы нашай суполкі вельмі ўдзячныя трупе Вольнага Тэатру за ўзьняцце праблемы зьніклых у Беларусі і сьвеце на такі высокі эмацыйны і пэрсанальны ўзровень. Нават і праз дзень пасьля спэктаклю мы ўсе яшчэ знаходзімся пад ягоным уражаньнем. Гэта так цудоўна, што беларускія пытаньні, нарэшце, ставяцца за межам Беларусі. Ды так прафэсійна і годна.

Дзякуй Мікалаю, і Натальлі, і Лаўру і ўсёй цудоўнай акторскай трупе Вольнага Тэатру! Прыджджайце да нас з новымі праектамі! Спадзяёмся на кінастужку наступным разам – бо гэта-ж Галівуд!

**Алекс АРЦЮХОВІЧ**



Bielarus561C.qxd 10/8/2009 10:46 PM Page 9



# Сьв. пам. а. Міхаіл БУРНОС (12.10.1926 – 07.09.2009)



Рэлігійны і грамадзкі лідэр аўстралійскіх беларусаў нарадзіўся ў малазямельнай сялянскай сям'і Мітрафана і Анастасьсі ў вёсцы Лясок, Карэліцкага павету, што ля Навагрудку ў Гарадзенскай вобласьці. Аднойчы айцец Міхаіл заўважыў мне, што маці запісала яго пад час 2-й сусьветнай вайны на два гады маладзейшым, каб не забралі ў войска і далі магчымасьць вучыцца. У невялікай картцы, якую даваў людзям арганізатар пахаваньня ля царквы БАПЦ у Адэляйдзе значылася, што айцец Міхаіл нарадзіўся 12-10-1926 і пражыў 82 гады, але, калі лічыць што ён нарадзіўся ў 1924-м, то цэлых 84.

Зь дзяцінства Міхась вылучаўся здольнасьцямі да навук і музыкі. Граў на мандаліне і гітары. Скончыў пачатковую школу ў Запольлі, працягваў навучэньне на настаўніка ў Навагрядзкай сэмінарыі, але вымушаны быў запісацца на выезд у Нямеччыну. Быў сябрам СБМ. Пакінуў Наваградак 27-5-1944. У Нямеччыне працаваў у рабочых вайсковых камандах, якія будавалі фальшывыя лётнішчы (г. Эгер, г. Брэслаў, г. Брыг). Пасьля сканчэньня 2-й сусьветнай вайны жыў у горадзе Флензбургу. Потым жыў у лягерох для ДП – Міттэнвальдзе (1947?), Ватэнштэце (1946-1948), Сіадорфе (1949). У Ватэнштэце вучыўся ў гімназіі імя Максіма Багдановіча. Актыўна ўдзельнічаў у лягернай культурна-масавай дзейнасьці, граў на гітары і мандаліне ў аркестры, кіраваў танцавальнай групай. У 1949 годе эміграваў у Аўстралію. Адпрацаваў два прымусовых гады ў металюргічным гарадку Ваяла (1950 — 1952, штат Паўднёвай Аўстраліі).

Пераехаў пазьней ў 1952 г. у Адэляйду, дзе прыняў царкоўны шлюб з Вольгай Пашкевіч, зь якой пазнаёміўся ў Ваяле. Праз некалькі гадоў далучыўся да ўжо створанай парафіі БАПЦ у Адэляйдзе. Маючы моцны тэнар, пачаў кіраваць парафіяльным хорам. Зь сярэдзіны 50-х увайшоў у склад парафіяльнага камітэту. Разам зь Левановічам арганізаваў (на кароткі час) музыкальную групу "Зорка". Пад час будоўлі БАПЦ у Адэляйдзе (1961-1963) ўваходзіў у склад кантралюючага гэтую справу беларускага актыву. Сябраваў першыя гады з закладальнікам беларускага рэлігійнага жыцьця ў Адэляйдзе айцом Міхасём (Шчурко), але вельмі хутка адыйшоў ад яго і далучыўся да дзейнасьці «групы Ролсана», якая зрабіла вялікія рэформы ў беларускім парафіяльным жыцьці ў Адэляйдзе. Актыўны ўдзельнік стварэньня першага статуту Беларускай Праваслаўнай Аўтакефальнай Царквы ў Адэляйдзе. Арганізатар і кіраўнік танцавальнага гуртка "Лявоніха" (1979-1987). Таленавіты, спакойны, разважны ў размовах і, нарэшце, духоўны не сваім становішчам, але ўнутраным станам, айцец Міхаіл рабіў на людзей вялікае ўраджаньне, меў давер. Таму прадстаўляў беларусаў Адэлайды ў працы Фэдэральнай Рады БААуА, уваходзіў у склад камітэту Рады. Шматразова абіраўся дэлегатам на сустрэчы беларусаў Аўстраліі. Адзін з арганізатараў зьбіраньня грашовай дапамогі ў Чарнобыльскі Фонд Беларусаў Аўстраліі. Доўгачасовы сябра, як рэлігійнага, так і грамадзкага беларускіх камітэтаў у Адэляйдзе.

Пасьвечаны ў іярэі 4-1-87. Настаяцель БАПЦ у Адэляйдзе (1987 — 1999). У 1999 г., у сувязі зь ціскам з боку асобнай групы беларусаў з парафіі БАПЦ у Адэляйдзе напісаў рэзыгнацыю з пасады настаяцеля БАПЦ. Вельмі коратка я магу зазначыць, што айцец Міхаіл быў апошнім лідэрам з "групы" Ролсана і пасьля перавыбараў Уладзімера Акавітага з пасады старшыні парафіяльнай рады застаўся ў адзінстве супраць тых, хто хацеў пераняць уладу ў парафіі БАПЦ у Адэляйдзе ў свае рукі. Адчуваючы вялікую несправядлівасьць усяго таго, што пачало рабіцца navакол яго-нага імя, айцец Міхаіл палічыў за лепшае адыйсьці ад працы настаяцеля і даць магчымасьць новаму парафіяльнаму камітэту знайсьці такога сьвятара, якога яны хацелі. Аднак айцец Міхаіл здоліў знайсьці сілы на высьвячэньне разам з айцом Аляксандрам Кулакоўскім (з Мэльбурну) дзялянкі зямлі на Торрэнс роўд, куды перанеслі БАПЦ з старога месца ля стадыёну (можа каб не гэты перанос, то усё было-б яшчэ доўгі час па-старому).

Але адыйшоўшы ад працы настаяцеля айцец Міхаіл не адыйшоў ад духоўнай дзейнасьці. Ён пачаў дапамагаць у Божай службе новаму сьвятару ЎАПЦ Аўгену (Квасьнюку). Цікава адзначыць, што айцец Аўген пазьней будзе запрошаны беларусамі ў БАПЦ у Адэляйдзе на працу ў парафію, менавіта тымі людзьмі, якім так не падабаўся айцец Міхаіл, але якія так і не змаглі знайсьці сабе сьвятара на Беласточчыне. У гэтыя гады айцец Міхаіл служыў паніхіды па Слуцкіх героях на сьвяткаваньнях Беларускага Аб'еднаньня ў Паўднёвай Аўстраліі, рабіў запісы на ўкраінскім радыё аб жыцьці беларусаў Адэляйды, змог зьездзіць на апошнюю, трынаццатую сустрэчу беларусаў Аўстраліі.

Аднак ў 2003 годзе айцец Міхаіл атрымаў цяжкую страту – адыйшла ў іншы сьвет спадарожніца яго жыцьця ў Аўстраліі матушка Вольга. Айцец Міхаіл яшчэ працягваў працаваць старшынём Беларускага Гістарычнага Згуртаваньня ў Аўстраліі, рабіў карэкцыі да кнігі «А хто там ідзе?», пісаў артыкулы, але стан ягонага здароўя пачаў хутка горшыцца, і праз некалькі гадоў ён трапіў у дом для састарэлых Aldersgate Village (Adelaide), дзе жыў да самой сьмерці. Я наведваў яго, ён ажываў, чуўшы беларускую гутарку, радасна казаў – то-ж памятаю вас, то-ж памятаю... За два тыдні да сьмерці айца Міхаіла я патэлефанаваў яму, але мне служачы адказаў, што айцец Міхаіл знаходзіцца ў стане глыбокага адпачынку. Так у панядзелак 7-9-2009 спынілася сэрца аднаго з самых лепшых сыноў Беларусі, таленавітага сьпевака, здольнага музыкі, добрага сябры, выдатнага арганізатара грамадзкага жыцьця, духоўнага лідэра на працягу доўгіх гадоў і вельмі інтэлігентнага, шчырага, сумленнага і добрага чалавека.

Пахаваньне айца Міхаіла адбылося ў БАПЦ у Адэляйдзе, у той царкве, дзе ён вёў Божыя службы на працягу 80-х і 90-х гадоў. Прысутнічалі яго дзьве дачкі Галіна і Ліля, унукі Джэймс і Грэг, прыехалі з Мэльбурну прадстаўнікі Фэдэральнай Рады спадары Аўген Груша і Фанік Корбут. Знайшоў час адведаць сьвятара і міністар ураду Паўднёвай Аўстраліі М. Аткінсан. Таксама былі на пахаваньні Калесьнікөвіч Уладзімер і Вера, Мазай Анатоль і Маша, спадар Васіль Яновіч, спадарыні Якша, Шамшурына, Дзітман, Чарнагалан і іншыя беларусы і ўкраінцы Адэлайды.

Айца Міхаіла пахавалі 11-9-2009 на могілках Centennial Park Cemetery (Adelaide, Goodwood Rd, 760). Божую службу адслужыў айцец Аўген. З прамовай да прысутных выступілі: Васіль Яновіч, Аўген Груша, Віктар Кавалеўскі. Айцец Аўген, будучы ўкраінскім сьвятаром, сказаў асобна слова ўдзячнасьці айцу Міхаілу за дапамогу і ахвярную працу ва ЎАПЦ у Адэляйдзе.



Айцец Міхаіл вылучаўся зь іншых беларусаў Аўстраліі тым, што аднолькава пасьпяхова працаваў як на грамадзкай, так і духоўнай нівах. Маючы вялікую здольнасьць да слова, музыкі, сьпеваў, ён, магчыма нават не жадаючы таго, адразу трапляў у цэнтар увагі, цягнуў да сябе людзей. Нездарма група фільмоўцаў зь Менску запісала ў выкананьні айца Міхаіла сьпеў "Магутны Божа" і пачала свой фільм "Востраў Антыподаў" менавіта гэтым сьпевам. Такія беларусы, як айцец Міхаіл на справе, а не на словах рабілі беларускае жыцьцё на іміграцыі. Рабілі спакойна, бязь сьпеху, аддаючы гэтай працы амаль увесь свой вольны час.

**Віктар КАВАЛЕЎСКІ, Аўстралія**

# "Спасьцігаючы каханьне" ў Вашынгтоне

Вечарам 16 верасьня ў Вашынгтоне адбылася прэм'ера спэктаклю беларускага "Вольнага Тэатру" "Спасьцігаючы каханьне".

Перад пачаткам прадстаўленьня да гледачоў звярнулася Натальля Каляда. Яна разам з Мікалаем Халезіным зьяўляецца стваральнікамі гэтай п'есы. Па сьведчаньні самых аўтараў, драма напісаная на аснове жыцьцёвых фактаў, рэальнай гісторыі каханьня Ірыны і Анатоля Красоўскіх. Гэта надае твору ня толькі вострае сацыяльнае гучаньне, але і значную палітычную афарбоўку. Спэктакаль "Спасьцігаючы каханьне" даў старт міжнароднай акцыі дзеячаў культуры ў падтрымку канвэнцыі ААН супраць гвалтоўных зьнікненьняў. Каб акрэсьліць праблему зьніклых людзей, аўтары выкарысталі жыцьцёвыя факты іншых краінаў, у тым ліку фатафакты.

Далікатна і чулліва расказана ў гэтым спэктаклі гісторыя Ірыны Красоўскай. Яе вобраз на сцэне ўвасобіла выдатная акторка Ганна Саламянская. Яе гераіня – цэнтральны пэрсанаж, які сімбалізуе сабой жанчыну, каханую і моцную асобу.

Надзвычайным тэмпэрамэнтам і эмацыйнасьцю вылучаючца вобразы, якія ўвасобіў актор Алег Сідорчык. Гледачы мелі магчымасьць пабачыць імгненныя пераўтварэньні з добрай, ласкавай бабулі да эгаістычнага, халоднага бацькі Ірыны, з гарэзьлівага няўседнага хлапчука-сябра да каханага мужа.

Трэба заўважыць, што драма вельмі глыбокая і сымбалічная. Яна знайшла водгук у кожнага гледача. Адгукаюцца ў памяці словы галоўнага героя, калі ён распавядае пра сваю сьмерць. І жахлівы холад пранізвае сэрца, бо гэта не легенда, а праўда жыцьця. У сьвеце заўсёды ёсьць пачварныя людзі, якія прагнуць улады і грошай, не зважаючы нават на тое, што да іх прыйдзецца, літаральна, ісьці па трупах. Натуральна, што ў крызісныя моманты чалавек зьвяртаецца да Бога. Менавіта тут сканцэнтраваны той патэнцыял, які падпітвае надзею на лепшую будучыню. Таму ў спэктакаль уключана малітва за бязьвінна асуджаных, напісаная польскім сьвятаром.

Спэктакаль крануў, бо паказаныя ў ім людзі з нашага сёньняшняга жыцьця. І таму, калі глядзіш "Спасьцігаючы каханьне" разумееш, тое што здарылася з галоўнай гераіняй, магло здарыцца з кожным з нас. А ці ня гэта галоўнае, калі ты выходзіш з тэатру нешта зразумеўшы?!

**Паводле www.belmov.org**

Bielarus561C.qxd 10/8/2009 10:46 PM Page 2



# Каляндар“БЕЛАРУСА”

**1 кастрычніка 1949 г.** часапіс канадскіх беларусаў “Беларускі эмігрант” перайшоў у газэтны фармат. Выданьне як часапіс было заснаванае ў лютым 1948 г. (рэдактар Кастусь Акула) і стала ці ня першым, створаным паваеннай эміграцыяй у Паўночнай Амэрыцы. Але гэта была і першая газэта паваеннай эміграцыі. Першы нумар “Беларускай трыбуны” зьявіўся 27 жніўня 1950 г., “Беларуса” – 20 верасьня 1950 г. “Беларускі Эмігрант” выдаваўся да красавіка 1954 г. Выйшла 54 нумары.



100 гадоў таму, **4 кастрычніка 1909 г.** (21.09 паводле старога стылю) у Нясьвіжы нарадзіўся **Дзьмітры Касмовіч**. На эміграцыю ён выехаў у 1928 г. Вучыўся і працаваў у Бэльгіі, потым у Югаславіі скончыў Бялградзкі унівэрсытэт. З пачаткам 2-й сусьветнай вайны вярнуўся на радзіму. За саветамі працаваў важным чыноўнікам у Нясьвіжы, быў дэпутатам Народнага сходу 1939 г. у Беластоку, езьдзіў у Маскву на сэсію Вярхоўн. Савету СССР, сустракаўся са Сталіным.

Пад нямецкай акупацыі стварыў атрады беларускай самаабароны на Браншчыне і Смаленшчыне. У 1944 г. пакінуў Беларусь, гэтым разам назаўсёды. Па вайне працаваў у структурах ЮНРРА. Жыў у Штутгарце. У 1954 г. Р. Астроўскі прызначыў яго кіраўніком Беларускага Вызвольнага Фронту. Касмовіч не пагаджаўся, абяцаў пакіраваць колькі месяцаў і сыйсьці. Але затрымаўся на гэтай пасадзе да сьмерці. Пісаў безьліч мэмарандумаў і зваротаў, удзельнічаў у сусьветных антыкамуністычных арганізацыях, езьдзіў на канфэрэнцыі. Прычым усю грамадзкую працу рабіў пасьля заробкавае, затрымліваючыся за працоўным сталом да позьняе ночы.

Памёр 23 красавіка 1991 г., некалькі месяцаў не дажыўшы да абвешчаньня незалежнасьці Беларусі.

**6 кастрычніка 2004 г.** памёр грамадзкі дзяяч **Васіль Мельяновіч.** Нарадзіўся 28 жніўня 1934 г. у Азярніцы (Лунінеччына). Служыў у амэрыканскім войску ў Панаме. Па дэмабілізацыі зрабіў прафэсійную і грамадзкую кар’еру. Скончыў гарадзкі ўнівэрсытэт у Нью-Ёрку і ўнівэрсытэт Дж. Вашынгтона. Працаваў у тэлефоннай кампаніі AT&T. Быў першым старшынём Рады этнічных арганізацый Мэрылэнду. У 1979 г. – старшыня Фэдэральнай рады беларускіх рэспубліканскіх клюбаў. У 1990-я пераехаў у Агаё, дзе далучыўся да грамады ў Кліўлэндзе. Па тэстамэнту быў спалены, а прах пахаваны ў Азярніцы.



**17 кастрычніка 1929 г.** нарадзіўся грамадзкі дзеяч **Міхась Бахар**. У ЗША ад 1951 г. Напачатку сям’я працавала ў фармэра ў Місісіпі, дзе М. Бахар скончыў унівэрсытэт з дыплёмам электрыка. Ад 1961 г. жыў у Саўт-Рывэры. Менавіта дзякуючы ягонай руплівасьці саўт-рывэрская грамада атрымала ў 1960-х гадох за мінімальны кошт пляц пад пабудову царквы й грамадзкага цэнтру. Памёр у 2007 г., пахаваны на беларускіх могілках у Саўт-Рывэры.

**23 кастрычніка 1909 г.** у Вялікім Сяле (Шаркаўшчынскі р-н) нарадзіўся **Міхась Зуй** – апошні прэзыдэнт БЦР (1988—1995). Зуй быў адным з асноўных дзеячоў у Аўстраліі, браў удзел у першым сходзе беларусаў Сіднэя, а ў сакавіку 1950 г. стварыў і нязьменна ўзначальваў Беларускае Аб’еднаньне ў Аўстраліі.

*АГ*




## Шаноўнае спадарства!

Паведамляем, што выйшаў з друку альманах беларускіх пісьменьнікаў замежжа “**БЕЛАРУС 2009**”. У сёлетнім 280-бачынкавым нумары зьмешчаныя творы 23-х аўтараў зь 9 краінаў сьвету. Падпісчыкі “Беларуса”, якія ахвяравалі на выдавецкі фонд газэты цягам апошняга году **$50** ці больш, атрымаюць альманах у падарунак. Іншыя аматары беларускай літаратуры могуць замовіць гэтае выданьне ў рэдакцыі, даслаўшы сваю замову на адрас:

**BIELARUS / P. O. Box 3225 / Farmingdale, NY 11735 USA**

Кошт альманаха разам з дасылкаю для жыхароў ЗША **$15**, Канады - **$18**, усіх іншых краінаў сьвету **$20.**

Жадаючыя могуць замовіць літаратурны альманах за 2007 і 2008 гады.
Разьлічваем на вашую зацікаўленасьць і падтрымку.







Фонд літаратурнай прэміі імя Зоры Кіпель атрымаў наступнае ахвяраваньне:
Г. Куліна-Патэ. . . . . . . . . . . $100.

Нью-Ёрскі аддзел БАЗА супольна з Галоўнай Управай ладзяць

## сьвяткаваньне 60-х угодкаў

**Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня (БАЗА)**, беларускай грамадзкай арганізацыі, якая ўвесь гэты час годна рэпрэзэнтуе беларусаў у Злучаных Штатах і ў Нью-Ёрку.

Запрашаем вас прыняць удзел у сьвяткаваньні й наведаць урачыстую акадэмію, банкет зь беларускіх страваў і сьвяточны канцэрт, на якім выступяць сьпевакі й музыкі зь Беларусі, Злучаных Штатаў і Канады.

Імпрэза адбудзецца **18 кастрычніка** 2009 г. у грамадзкай залі пры саборы сьв. Кірылы Тураўскага ў Брукліне па адрасу:

***St. Cyril of Turau Cathedral***
***401 Atlantic Avenue (at Bond Street)***
***Brooklyn, NY 11217***

Кошт квітка за асобу – **$30**. Пачатак сьвяткаваньня а **1:00 папаўдні**.
Вас чакаюць беларускае асяродзьдзе, прыемная атмасфэра, смачная ежа, мілыя сустрэчы. Далучайцеся да землякоў!

## Прыватныя абвесткі

Аддам задарма студэнту, які цікавіцца беларусікай, камплект (13 тамоў) Беларускай савецкай энцыкляпэдыі з паказьнікам.

***Янка ЗАПРУДНІК, тэл. (732) 247-1822***

* * *

**Міхася Слабодзкага**, якому 25 лістапада спаўняецца 30 гадоў ад дня нараджэньня, віншуе і жадае моцнага здароўя, валікага каханьня, шчасьлівага жыцьця ды посьпехаў у працы ***Пятрусь КАПЧЫК*** з Украіны.

* * *

Шчыры дзякуй спадарыні **Лізавеце Літаровіч** з Саўт-Рывэру за цудоўны падарунак — кнігу “Беларускі кангрэсовы камітэт Амэрыкі”, дзякуючы якой я шмат даведаўся пра беларусаў Амэрыкі.

***Пятрусь КАПЧЫК. Ізяслаў, Украіна***

***Газэта “БЕЛАРУС” бясплатна надрукуе кароткія прыватныя паведамленьні й аб’явы некамэрцыйнага характару, віншаваньні, запрашэньні, спачуваньні ды інш.***
***Накont разьмяшчэньня рэклямы кантактуйце рэдакцыю.***

## НА ВЫДАВЕЦКІ ФОНД “БЕЛАРУСА” АХВЯРАВАЛІ:

| | |
|---|---|
| **А. Курушка** | 100 |
| **М. Грынчук** | 75 |
| **Г. Куліна-Патэ** | 75 |
| **І. Ільчук** | 70 |
| **Г. Архіпаў** | 50 |
| **К. Баслык** | 50 |
| **В. Едз іновіч** | 50 |
| **Я. Іваноў** | 50 |
| **С. Змачынскі** | 50 |
| **Н. Козел** | 50 |
| **Д. Кустаў** | 50 |
| **Д. Кучараў** | 50 |
| **М. Лянкевіч** | 50 |
| **Ю. Ляоненка** | 50 |
| **Н. Магамедаў** | 50 |
| **А. Маісеева** | 50 |
| **Ю. Міцькевіч** | 50 |
| **А. Мятлушка** | 50 |
| **А. Нярэзька** | 50 |
| **В. Пакорская** | 50 |
| **І. і К. Пікалюк** | 50 |
| **А. Тур** | 50 |
| **А. Турко** | 50 |
| **Т. Яседчык** | 50 |

**Усім шчыры дзякуй!**

**БЕЛАРУС**
*Газэта Беларусаў у Вольным Сьвеце*
**Выдае штомесячна:**
***Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне***
**Сусьветнае сеціва:** ***baza-belarus.org***
**Падпіска $50 на год.**
**Чэкі выпісвайце на *BIELARUS***

**BIELARUS**
*Belarusan Newspaper in the Free World*
Published monthly by
***Belarusan American Ass’n, Inc.***
Subscription $50 yearly
Make checks payable to ***BIELARUS***
**Рэдагуе калегія.**
**Адказны рэдактар Марат КЛАКОЦКІ**
**Падпіска Сяргей ТРЫГУБОВІЧ**
**Артыкулы, падпісаныя прозьвішчам ці ініцыяламі, могуць зьмяшчаць погляды, зь якімі Рэдакцыя не згаджаецца.**
**Передрук дазваляецца толькі пры ўмове зазначэньня крыніцы.**
© BIELARUS, 2009
**Адрас для допісаў і кантактаў:**
***BIELARUS***
***P.O. Box 3225***
***Farmingdale, NY 11735***
E-mail:
***hazetabielarus@att.net***
**Сусьветнае сеціва:**
***www.bielarus.org***
ISSN 1054-9455
**Адказнасьць за зьмест рэклямы нясе рэклямадаўца.**